Рыжанка пра беларускую сталіцу

СТАР. 5

Ці выносіць сваркі з хаты?

СТАР. 7

Геній свайго часу – Анджэй Вайда

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. СУБОТА № 200 (28310)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Фота БЕЛТА.

БЯСПЕКА РОЎНАЯ І НЕПАДЗЕЛЬНАЯ

Лідары дзяржаў — удзельніц Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы зацвердзілі стратэгію калектыўнай бяспекі АДКБ да 2025 года на сустрэчы ў Ерэване

Як паведаміў карэспандэнт БЕЛТА, у час саміту Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў, што АДКБ не трэба чакаць прызнання з боку НАТА. «Мы ўсе канстатавалі, што АДКБ ніхто не хоча прызнаваць, асабліва НАТА (бачыце, арганізацыя не тая). Я слухаў гэтыя размовы і думаў: калі мы будзем іх прасіць, каб яны нас прызналі, яны ніколі нас не прызнаюць. Нам трэба зрабіць такім чынам, каб прымусіць іх прызнаць нашу арганізацыю», — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

СТАР. 2

ТРЫ КІРЫЛЫ Ў ТУРАВЕ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У Тураве многіх хлопчыкаў называюць у гонар беларускага Златавуста і асветніка Кірылы Тураўскага. У гэтым знакамітым спісе значацца таксама падлеткі-землякі Кірыл Патапенка і Кірыл Жураўскі. Яны — вучні 2-й Тураўскай школы, больш за тое — аднакласнікі. А яшчэ яны наведваюць нядзельную дзіцячую школу пры царкве Кірылы і Лаўрэнція Тураўскіх. На здымку цёзкі разглядаюць абраз беларускага святога, які знаходзіцца ў алтары новага храма.
г. Тураў, Жыткавіцкі раён.

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл МАЛАШЭНКА, намеснік старшыні Дзяржстандарта — дырэктар Дэпартамента па энергаэфектыўнасці:

«Беларусь імкнецца да скарачэння энергетычнай залежнасці ад пастаўшчыкоў энергарэсурсаў, арыентуючыся на вопыт іншых краін, працуе над тым, каб задзейнічаць аднаўляльныя крыніцы энергіі, якія могуць замяніць значную долю энергарэсурсаў у балансе краіны».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 7°
Віцебск	+ 4
Гомель	+ 5°
Гродна	+ 5
Магілёў	+ 4
Мінск	+ 5

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.10.2016 г.

Долар ЗША	1,9251 ▼
Еўра	2,1201 ▼
Рас. руб.	0,0305 ▲
Укр. грыўня	0,0747 ▼

ISSN 1990 - 763X

■ Абмяркуем!

У школу — па веды, але не любой цаной

Выкананне хатніх заданняў не павінна займаць у старшакласнікаў больш як 3 гадзіны, у вучняў сярэдніх класаў — 2—2,5 гадзіны, у трэцім і чацвёртым класах — 1,5 гадзіны, а ў другім класе — 1,2 гадзіны. Гэта максімальна дапушчальныя нагрузкі, установленыя санітарнай службай. Менш — можна, а вось больш (без шкоды для здароўя) нельга.

А цяпер давайце зойдземся простай арыфметыкай: у старшых класах у вучняў не менш як шэсць урокаў штодня. І калі па кожным прадмеце настаўнік задае хатняе заданне, то тэарэтычна на кожную дысцыпліну падлетак павінен выдаткаваць не больш як 30 хвілін, каб падрыхтавацца да наступнага ўрока. Але ж ці такое магчыма? А што рабіць, калі дзіця вымушана дадаткова займацца яшчэ і з рэпетытарамі?

Па расійскай статыстыцы, вучні малодшых класаў выдаткоўваюць на вучобу ў школе і падрыхтоўку хатніх заданняў 9—10 гадзін штодня, а ў сярэдняй школе — ужо 13—15 гадзін. У нашай краіне даследаванні, як распараджаюцца сваім часам школьнікі па-за ўрокамі, не праводзіліся. Але вядома, што 20% дзяцей 10—12 гадоў спяць менш як 8 гадзін у суткі і кожнае пятае дзіця ў такім узросце ў выхадныя дні праводзіць на вуліцы менш як дзве гадзіны. Наколькі вялікі ўплыў аказвае на здароўе дзяцей унутрышкольнае асяроддзе, абмяркоўвалі падчас «круглага стала» прадстаўнікі сістэмы адукацыі і аховы здароўя.

Як за 11 гадоў вучобы не страціць здароўе?

СТАР. 4

БЯСПЕКА РОЎНАЯ І НЕПАДЗЕЛЬНАЯ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў ходзе працяглых перагавораў лідараў дзяржаў АДКБ у вузкім складзе бакі абмеркавалі шырокі комплекс тэм і правялі прынцыповы аналіз праблемных пытанняў у свеце. «Прытым па перыметры ўсіх граніц — і на заходнім напрамку, і ў Цэнтральнай Азіі, у раёне Афганістана. Абмеркавалі канфлікты і нявырашаныя праблемы, — адзначыў беларускі лідар. — Шчыра прызнаюся, што тыя падрыхтаваныя матэрыялы па прыярытэтах нашага старшынства крыху не цягнуць на той узровень абмеркавання, на які мы выйшлі ў вузкім коле».

Паводле слоў Прэзідэнта Беларусі, бакі дамовіліся, што пры ўдзеле генеральнага сакратара АДКБ Мікалая Бардзюжы будзе вызначана група ваенных і спецыялістаў у іншых галінах. «Прыцягнем да гэтага спецыялістаў перш за ўсё з Расійскай Федэрацыі і іншых дзяржаў. І трэба сфармуляваць добрыя прыярытэты, каб наша арганізацыя выйшла на даволі сур'ёзны ўзровень. Каб яе не баяліся, але паважалі, і мы нікога не ўгаворвалі, каб нас прызнавалі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Прыярытэты беларускага старшынства ў АДКБ будуць грунтоўна прапрацаваны і даведзены да кіраўнікоў у краінах арганізацыі, дадаў беларускі лідар. «Лічу, мы штосьці добрае можам прапанаваць нашай арганізацыі ў плане адзінства і паважання з боку контрпартнёраў», — рэзюмаваў ён.

Прэзідэнт Арменіі Серж Саргсян на выніковым брыфінгу для прадстаўнікоў СМІ праінфармаваў, што на саміце прыняты шэраг сур'ёзных дакументаў і рашэнняў, накіраваных на істотнае ўмацаванне патэнцыялу арганізацыі з удасканаленнем механізмаў калектыўнай бяспекі і рабочых органаў АДКБ.

Прынятую стратэгію калектыўнай бяспекі АДКБ да 2025 года Прэзідэнт Арменіі назваў адным з самых важных дакументаў саміту. Праца над дакументам доўжылася на працягу некалькіх гадоў.

«Стратэгія АДКБ фіксуе прыярытэт у дзейнасці арганізацыі да 2025 года, замацоўвае арыенціры далейшага развіцця па ўсіх асноўных напрамках супрацоўніцтва. Дзяржавы-члены зноў пацвердзілі сваю рашучасць выбудоўваць адносіны з членамі сусветнай супольнасці на асновах роўнасці і непадзельнасці бяспекі. Устрымлівацца ад пагрозы сілай або яе прымянення ў вырашэнні праблем, якія ўзнікаюць, аддаючы прыярытэт палітыка-дыпламатычным метадам», — сказаў Прэзідэнт Арменіі.

Па выніках сустрэчы таксама прыняты заявы, якія адлюстроўваюць падыходы краін АДКБ да асноўных актуальных міжнародных пытанняў, дадзены ацэнкі бягучай сітуацыі з улікам новых пагроз і выклікаў. Кіраўнікі дзяржаў яшчэ раз пацвердзілі ролю АДКБ у якасці найважнейшага інструмента, які спрыяе падтрыманню міру, стабільнасці, забеспячэнню бяспекі, незалежнасці і суверэнітэту дзяржаў-членаў.

Падпісана рашэнне аб канцэпцыі развіцця сістэмы сумеснай падрыхтоўкі ваенных кадраў, а таксама па стандартызацыі ўзбраення і ваеннай тэхнікі ў АДКБ.

Акрамя таго, падпісаны дакументы ў сферы процідзеяння міжнароднаму тэрарызму. У іх ліку — Палажэнне аб фарміраванні адзінага спісу арганізацый, прызнаных тэрарыстычнымі. Серж Саргсян асобна вылучыў рашэнне аб палажэннях, якія рэгламентуюць дзейнасць Аб'яднанага штаба АДКБ.

Старшынства ў арганізацыі дамовы аб калектыўнай бяспецы цяпер перайшло ад Арменіі да Беларусі.

■ Сувязі

КАМБАЙНЫ З ЦУКЕРКАМІ ДЛЯ КІТАЯ

У Паднябеснай добра ведаюць якасць беларускай сельскагаспадарчай тэхнікі

Гомсельмаш сёння актыўна супрацоўнічае з Кітайскай Народнай Рэспублікай. Доля сельскагаспадарчай тэхнікі прадпрыемства дасягае амаль 70% ад усяго экспарту тавараў Гомельскай вобласці ў гэтую краіну. Пра гэта расказалі ў прэс-службе Гомельскага аблвыканкама. Прадпрыемства падпісала некалькі дамоў з рознымі кітайскімі карпарацыямі аб інвеставанні грашовых сродкаў, развіцці існуючых праектаў і іншых варыянтаў супрацоўніцтва.

Фота БЕЛТА.

І на кітайскіх палетках беларускія трактары працуюць эфектыўна.

Амаль шэсць гадоў, як у Харбіне працуе сумеснае прадпрыемства Гомсельмаша і карпарацыі «DongjinGroup». За гэты час было выраблена звыш дзвюх тысяч камбайнаў. Два гады таму ў Пекіне пачаў работу дылерскі цэнтр Гомсельмаша на базе Пекінскай кампаніі дзяржаўных саўгасаў па імпарце-экспарце. У маі мінулага года падчас афіцыйнага візіту ўрадавай дэлегацыі КНР у Беларусь на чале са старшынёй КНР Сі Цзіньпінам была падпісана дамова пра стварэнне сумеснага прадпрыемства Гомсельмаша і прамысловай карпарацыі «Цзуншэнь» з адкрыццём дзвюх зборачных пляцовак у правінцыях Хэбэй і Ганьсу.

У верасні мінулага года зарэгістравана сумеснае прадпрыемства сельгасмашынабудавання і адбылося ўрачыстае адкрыццё першай зборачнай пляцоўкі ў правінцыі Хэбэй. Цяпер тут вядзецца падрыхтоўка вытворчасці і закупляецца неабходнае абсталяванне.

Запатрабаваныя ў нашых далёкіх партнёраў воўна, лён, вотруб'е, вугляроднае валакно і вырабы з яго. Апошнюю прадукцыю пастаўляе «Светлагорскхімвалакно». Вырабы фабрыкі «Спартак» і рагачоўскага завода «Дыяпраектар» таксама ведаюць спажыўцы ў КНР. Летась былі пачаты пастаўкі скурак норкі ад Калінкавіцкай зверагаспадаркі. Увогуле ж экспарт за сем першых месяцаў года склаў $3,7 млн.

Што тычыцца імпарту (за той жа час атрымана тавараў на $99,8 млн), тут асноўнымі з'яўляюцца машыны і абсталяванне, электратэхнічная прадукцыя і кабелі, вырабы з чорных металаў, каменя, пліты, лісты і вырабы з пластмасы і іншае.

Са студзеня па ліпень знешнегандлёвы абарот прадпрыемстваў і арганізацый Гомельскай вобласці з Кітаем склаў $103,5 млн, пры гэтым тэмп росту — амаль 65%. Сёння прадпрыемствы Гомельскай вобласці актыўна ствараюць сумесныя з кітайскімі партнёрамі прадпрыемствы, каб развіваць гандлёвае супрацоўніцтва і забяспечыць збалансаванасць двухбаковых сувязяў.

Смак цукерак пад брэндам «Спартак» кітайцы ўжо ведаюць. Прадукцыя прадпрыемства атрымала сертыфікацыю тавараў на кітайскім рынку. За першае паўгоддзе ў Кітай было адгружана 32 тоны прадукцыі. Дарэчы, прадпрыемства стварыла сайт на кітайскай мове, і колькасць наведвальнікаў пастаянна расце. Не выключэнне, што хутка кітайцы будуць ведаць і нашы мяса-малочныя вырабы. Адпаведны пратакол пра намеры паміж Камітэтам па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта і Цзянсунскай групавой кампаніяй па замежным супрацоўніцтве падпісаны. Размова ідзе і пра экспарт мёду з Гомельшчыны ў Кітай.

У сферы крэдытна-інвестыцыйнага супрацоўніцтва на тэрыторыі Гомельскай вобласці некалькі праектаў ужо рэалізавана і многія рэалізуюцца. З Мінска да Гомеля цяпер можна даехаць на аўтамабілі за тры гадзіны, дзякуючы праведзенай рэканструкцыі дарогі М 5/Е271. Генеральным падрадчыкам праекта стала кітайская карпарацыя «China road and bridge corporation».

Завяршаецца будаўніцтва завода па вытворчасці сульфатнай беленай цэлюлозы на базе Светлагорскага цэлюлознага камбіната. Кошт праекта складае $902,8 млн. Фінансаванне кантракта ажыццяўляецца за кошт крэдыту экспартна-імпартнага банка Кітая. Генеральны падрадчык — кітайская кампанія інжынірынгу «CAMC».

Тэхнічнае пераабсталяванне Добрушскай папяровай фабрыкі «Герой працы» таксама падыходзіць да фіналу. Тут будзе арганізавана вытворчасць мелаваных і немелаваных відаў кардону. Фінансаванне праекта поўнасцю ажыццяўляецца за кошт сродкаў крэдыту Дзяржаўнага банка Развіцця Кітая.

На базе Гомельскага матараремонтнага завода арганізана вытворчасць мотатэхнікі, матакультыватараў і малалітражных рухавікоў фірмы «Хорс Мотарс» сумесна з кітайскай кампаніяй «I.I.C. IMPORT & EXPORT CO., LIMITED».

Зусім нядаўна ў Гомельскім аблвыканкаме прайшла сустрэча з кітайскай карпарацыяй інжынірынгу «CAMC», на якой абмеркавана магчымасць будаўніцтва магістральнай вуліцы ў Гомелі працягласцю 41,35 км (з улікам будаўніцтва маста праз Сож і пяці пуцеправодаў).

Адным з буйных праектаў з прыцягненнем крэдытных рэсурсаў Кітайскай Народнай Рэспублікі з'яўляецца фінансаванне будаўніцтва ўчастка чыгункі Глушкавічы-Лельчыцы-Міхалкі. У ліпені прайшлі перамовы з кітайскай карпарацыяй CGGC «Гечжоуба», якая выказала зацікаўленасць у рэалізацыі гэтага праекта, а таксама ў распрацоўцы радовішча гранітаў каля Глушкавічаў.

Актыўна вядзецца міжрэгіянальнае супрацоўніцтва, ажыццяўляецца абмен візітамі прадстаўнікоў дзелавых кругоў і ўдзел у прамысловых выставах. Заключана шмат дамоў пра супрацоўніцтва з рознымі правінцыямі. У Мазыра і Жлобіна з'явіліся гарады-пабрацімы ў Кітаі: Сюйчжоу і Ляньюньган адпаведна. Дакументы аб гэтым былі падпісаны падчас візіту дэлегацыі Гомельскай вобласці ў КНР.

Пастаянна пашыраецца міжнароднае супрацоўніцтва Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны з вядучымі ВНУ Кітая. Абмен навуковымі кадрамі стане прыярытэтам на бліжэйшы час. Сяброўскія стасункі паміж гомельскімі і кітайскімі вучонымі падтрымліваюцца на працягу чвэрці стагоддзя. Паміж ВНУ і навуковымі цэнтрамі Кітая і ГДУ імя Ф. Скарыны падпісана больш 20 дамоў пра супрацоўніцтва.

У верасні ў Гомельскі ўніверсітэт для абмену вопытам на паўгода прыбыла сям'я выкладчыкаў-матэматыкаў з педагагічнага ўніверсітэта Цзянсу. У сваю чаргу, праз тыдзень (18 кастрычніка) гомельскія маладыя навукоўцы з Беларуска-кітайскай навуковай лабараторыі па вакуумна-плазменных тэхналогіях адправяцца на стажыроўку ў Нанкінскі ўніверсітэт. Адзін з перспектыўных накірункаў супрацоўніцтва — сумесная падрыхтоўка спецыялістаў. З 2006-га па 2012 год 36 кітайскіх студэнтаў атрымалі ў Гомелі дыплом бакалаўра. Увогуле з 1992 года ў ГДУ імя Ф. Скарыны навуковую стажыроўку прайшлі 10 выкладчыкаў з КНР. 335 грамадзян гэтай краіны вучыліся ў Гомелі, з іх ступень бакалаўра атрымалі 140 чалавек, дзевяць скончылі аспірантуру і паспяхова абаранілі кандыдацкія і нават доктарскую дысертацыі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
iost@zviazda.by

■

Агульныя ідэалы і каштоўнасці,

або Літаратура як падмурак Саюзнай дзяржавы

Другі з'езд Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы прайшоў у Маскве ў Дзелавым і культурным комплексе пасольства Беларусі ў Расіі.

Прывітанне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ўдзельнікам форуму зачытаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар Бузоўскі. У пасланні кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што на рахунку Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы ёсць паспяховыя сумесныя праекты.

«Дзякуючы вашым намаганням пераклады лепшых твораў сучасных беларускіх аўтараў рэгулярна з'яўляюцца на старонках расійскіх выданняў, а беларускія чытачы маюць магчымасць знаёміцца з творчасцю рускіх паэтаў, празаікаў, публіцыстаў», — падкрэсліваецца ў прывітанні. Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў упэўненасць, што дзейнасць Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы і ў далейшым будзе садзейнічаць развіццю і ўзаемаўзбагачэнню беларускай і рускай літаратуры.

Як паведаміў карэспандэнт БЕЛТА, у сваім выступленні Ігар Бузоўскі адзначыў, што падобныя да гэтага з'езду мерапрыемствы зараз набываюць асаблівае значэнне для адстойвання агульнакультурных інтарэсаў. «Выклікі часу, якія сёння гучаць, абвастраюць патрабаванні, што прад'яўляюцца да літаратараў», — сказаў ён. Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта выказаў шчырае спадзяванне, што слова пісьменніка будзе мець важкае значэнне ў фарміраванні Саюза Беларусі і Расіі.

Прывітанне форуму накіраваў таксама Патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Кірыл.

На з'ездзе ў Маскве сабраліся каля 120 дэлегатаў з Беларусі, Расіі, а таксама палітычныя і грамадскія дзеячы з дзвюх краін. На форуме былі падведзены вынікі дзейнасці па захаванню і ўмацаванню духоўна-гістарычнага адзінства літаратур, краін, народаў. Быў абмеркаваны план сумеснай работы на бліжэйшыя 5 гадоў і перавыбраны склад кіруючых органаў саюза.

Саюз пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы быў утвораны на ўстаноўчым з'ездзе, які адбыўся ў снежні 2009 года ў Мінску. Галоўная задача саюза — садзейнічанне ўмацаванню сяброўскіх, палітычных і эканамічных адносін паміж Беларуссю і Расіяй.

У кулуарах пісьменніцкага з'езда, гутарачы з журналістамі, **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар БУЗОЎСКІ** заявіў, што сацыяльныя функцыі, якія выконваюцца творчай элітай у цэлым і пісьменніцкім асяроддзем у прыватнасці, нельга ацэньваць выключна рублём.

Паводле яго слоў, тэма праздмернай камерцыялізацыі творчасці і тым больш пытанняў, звязаных з узаемадзеяннем творчай эліты Саюзнай дзяржавы, павінна не проста абмяркоўвацца, яе неабходна паставіць на парадак як адну з прыярытэтных. Ён адзначыў, што сучасныя эканамічныя ўмовы, вядома ж, дыктуюць свае прыярытэты, аднак без падтрымкі творчыя сілы не змогуць выконваць тыя сацыяльныя функцыі, якія гістарычна былі ўскладзеныя на іх грамадствам. «Недастатковае разуменне гэтых рэчаў прыводзіць да расхістання і дэградацыі не толькі асобна ўзятых творчых аб'яднанняў, а, упэўнены, і каштоўнасцяў, якія з'яўляюцца дзяржаўнымі асновамі, якія мы павінны не проста шанаваць, але і змагацца за іх», — падкрэсліў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Ігар Бузоўскі запэўніў, што выдаткі дзяржавы на падтрымку сацыяльна значнай літаратуры павінны быць захаваны і адэкватныя выклікам часу. «Друкаванае слова, якое застанецца ў стагоддзях, — гэта праца на будучыню, гэта падмурак для будучага развіцця дзяржавы», — сказаў ён.

Такую ж пазіцыю дзяржава займае і ў дачыненні да сродкаў масавай інфармацыі. «Нам перыядычна навязваецца, што яны павінны быць цалкам самаакупнымі, — адзначыў Ігар Бузоўскі. — Але аб якой самаакупнасці можа ісці гаворка, калі мы гаворым пра сацыяльныя, культуралагічныя функцыі? Гэта затратныя рэчы, яны вяртаюцца з часам. Манетызацыя адбываецца праз дзясяткі гадоў, але калі гэты падмурак мы разбурым, зруйнуецца наша будучыня».

Ігар Бузоўскі перакананы, што адстойванне каштоўнасцяў і ідэалаў — гэта ў тым ліку і адстойванне незалежнасці дзяржавы. «Голас пісьменніцкага асяроддзя, голас творчага асяроддзя павінен быць значна больш моцным у адстойванні гэтай незалежнасці, — сказаў ён. — Заявы асобна ўзятых пісьменнікаў, асобна ўзятых творчых асоб — гэта добра, але кансалідаваць іх памкненні павінны менавіта такія форумы, праз прадстаўніцтва эліт Саюзнай дзяржавы».

Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта лічыць, што выпрацаваныя стагоддзямі агульныя каштоўнасці і ідэалы, уласцівыя беларускаму і расійскаму народам, дазволілі выстаяць ім у Вялікай Айчыннай вайне, спраўляцца з выклікамі часу на працягу станаўлення дзяржаў.

«Незалежнасць — гэта нашы каштоўнасці і ідэалы з асаблівасцямі, уласцівымі кожнаму народу, культуры, нацыянальнаму менталітэту, якія мы адстойваем, абараняем. Кансалідавацца творчым элітам неабходна менавіта на гэтым», — сказаў Ігар Бузоўскі.

■ Вуліцы горада

ПАБУДАВАЎ КВАТЭРУ САБЕ — ЗРАБІ І ДЛЯ ПТУШКІ

У сталіцы з'явяцца шпакоўні і сінічнікі

Гэта было б не так дзіўна, але павесяць іх не на звычайных дрэвах, а на намаляваных. Муралы (малюнкі на сценах), якія з'явіліся ў Мінску, «ажывуць». Такую ідэю распрацавала арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Старт праекта — наступнай вясной.

Новыя методыкі азелянення ўрбаністычнай прасторы распрацоўвае Акадэмія навук.

У гарадскіх птушак існуюць дзве праблемы: месца для гнездавання і недахопы харчавання ўзімку. Даволі шмат шпакоўняў ужо існуюць у сталіцы. Але колькасць не ёсць якасць, расказвае **Карына САЛАВЕЙ, спецыяліст па развіцці АПБ:**

— Сёлета мы зрабілі дзесяць штучных шпакоўняў. Зараз мы прапануем людзям рабіць сінічнікі, бо маленькім птушкам недзе жыць. А шпакі бойкія і ўсё займаюць. У кронах намаляваных дрэў будуць размешчаны штучныя гняздоўні. З дапамогай спецыяліста-арнітолага мы прааналізавалі вуліцу. Прыродаахоўнік казаў, што на пэўнай адлегласці можна нармальна размясціць сінічнікі, і вялікая верагоднасць, што птушкі заселяцца. Яны не любяць блізкага суседства: асабістая прастора ёсць не толькі ў людзей. Цяпер у нас вядуцца перамовы з кавярнямі, якія знаходзяцца на вуліцы Кастрычніцкай. Мы прапанавалі зрабіць ім гарадскія кармушкі — гэта і карысць для птушак, і асалода для наведвальнікаў. Ёсць такая праблема, што птушкі харчуюцца не тым, чым трэба. А зараз мы прапануем прадаваць мяшочкі з чорнымі семкамі.

Ігар КОРЗУН, прадстаўнік таварыства «Зялёная сетка», адзначае, што з боку эколагаў ёсць цікавасць прасунуць не проста архітэктурныя методыкі і рашэнні, а канцэптуальныя ідэі па азеляненні горада.

— Акадэмія навук па заказе дзяржавы даўно распрацавала розныя методыкі азелянення гарадской прасторы, «забітай» у выніку новабудоўляў, індустрыялізацыі і шэрагу іншых рэчаў. Гэта новыя методыкі рэнавацыі з улікам еўрапейскага і амерыканскага вопыту з выкарыстаннем раслін, як нязвыклых для нашага клімату, так і пасрэдных, якія мы называем пустазеллем, але яны цікавыя для выкарыстання і ў практыцы азелянення. Выглядаюць яны прывабна. Праўда, нельга пайсці на пустку і іх назбіраць. Супрацоўнікі Акадэміі навук, у прыватнасці Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В.Ф. Купрэвіча, ужо даўно займаюцца працамі па селекцыі абарыгенных травяністых раслін. Напрыклад, міскантус. Чым ён добры? Ён хутка ідзе ў рост, вельмі высокі, дае багатую зялёную масу і пышна выглядае нават у зімовы перыяд. Тады, калі яго травяністая частка адмірае, сваім залацістым колерам ён упрыгожвае і зімовы пейзаж. Плюс да ўсяго, ён не можа распаўсюджвацца бескантрольна. Добра загароджвае некаторыя гарадскія часткі, якія не вельмі цешаць наш погляд.

Прадстаўнік Інфармацыйнага цэнтра па пытаннях хімічнай бяспекі і адходаў Цэнтра экалагічных рашэнняў Наталля БЛЫШЧЫК занепакоена асобным зборам смецця на вуліцах:

— Кантэйнеры для паперы мы вырашылі не ставіць, таму што гэта такі матэрыял, які прыдатны для перапрацоўкі ў чыстым выглядзе. А тое, што тут будзе збірацца, хутчэй за ўсё, будзе брудным. Папяровы посуд — адна з самых вялікіх бед усіх эколагаў. Яны не перапрацоўваюцца, а імгненна становяцца адходамі. Прычым іх выкарыстанне яшчэ нясе і пэўную шкоду для здароўя. На папяровы посуд знутры нанесена пластыкавая плёнка, якая пад уздзеяннем высокіх тэмператур вылучае шкодныя рэчывы. Адна з ініцыятыў — паменшыць іх колькасць. Я хаджу са сваім кубкам, шкляным або з пластыку, прыдатнага для шматразовага выкарыстання. У кафэ мне наліваюць у мой кубак і часам нават робяць зніжку.

Надзея АНІСОВІЧ.
anisovich@zviazda.by

■ Сацыяльнае партнёрства

СТАЎКА НА ВАЛАНЦЁРАЎ

Беларускі Чырвоны Крыж зацвердзіў стратэгію на наступныя пяць гадоў

Сярод асноўных напрамкаў дзейнасці — рэагаванне на надзвычайныя і крызісныя сітуацыі, медыцынская дапамога, сацыяльная падтрымка і догляд дома, абарона інтарэсаў уразлівых груп, адукацыя і інфармаванне насельніцтва.

— Тыя праекты, якія сёння ажыццяўляюцца, напрыклад, падтрымка людзей з псіхічнымі захворваннямі, сацыяльная адаптацыя былых асуджаных, атрымаюць працяг, — запэўніў **генеральны сакратар Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа Віктар КАЛАБАНАЎ** на XXIII з'ездзе арганізацыі.

Ён таксама адзначыў, што мінулая пяцігодка была вельмі паспяховай. Павялічыўся штат сёстраў міласэрнасці (са 122 да 147 ставак), выросла колькасць валанцёраў (калі ў 2011 годзе іх было 21 тысяча чалавек, то ў 2015-м — 22,7 тысячы). Была створана служба рэагавання на надзвычайныя сітуацыі, запушчаны новы праект, які папулярызуе здаровы лад жыцця.

Палепшылася фінансавая сітуацыя арганізацыі. За папярэднія пяць гадоў Беларускі Чырвоны Крыж прыцягнуў у краіну 9,6 мільёна долараў. Гэтыя інвестыцыі былі накіраваны на падтрымку найбольш уразлівых катэгорый насельніцтва. А паступленні бязвыплатнай замежнай дапамогі павялічыліся за гэты перыяд у чатыры разы.

— Дзяржаве выгадна працаваць з грамадскімі арганізацыямі, бо прыцягваюцца дадатковыя і фінансавыя, і чалавечыя рэсурсы, — лічыць **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама і старшыня прэзідыума абласной арганізацыі Беларускага Чырвонага Крыжа Віктар ЛІСКОВІЧ**. — Гэтым самым мы здымаем нагрузку з бюджэту і ў той жа час паляпшаем якасць жыцця людзей, якія маюць патрэбу ў доглядзе.

На з'ездзе выбралі таксама новага генеральнага сакратара таварыства. Ім стала Вольга МЫЧКО, якая раней працавала галоўным урачом бальніцы паліятыўнага догляду «Хоспіс», а цяпер з'яўляецца дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

■ Факт

Ці ёсць на рынку антыканкурэнтныя пагадненні?

Гэта будзе праверана ў дачыненні да шэрагу тавараў

Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю ў рамках ускладзеных на яго паўнамоцтваў прыступіла да ацэнкі стану таварных рынкаў мяса свініны, птушкі, жывой рыбы і малака.

Мэта — выяўленне і спыненне парушэнняў заканадаўства ў галіне процідзеяння манапалістычнай дзейнасці і развіцця канкурэнцыі, а таксама парушэнняў парадку правядзення працэдур дзяржаўных закупак і закупак за кошт уласных сродкаў (у выпадках, калі іх правядзенне з'яўляецца абавязковым у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь).

У прыватнасці, забароне падлягаюць пагадненні, узгодненыя дзеянні паміж канкурэнтамі, што дзейнічаюць на адным таварным рынку, якія маюць або могуць мець сваім вынікам раздзел таварнага рынку па тэрытарыяльным прынцыпе, аб'ёмах здзелак, відах, аб'ёмах тавараў і іх цэнах (тарыфах), коле прадаўцоў альбо спажыўцоў; выключэнне або абмежаванне доступу на таварны рынак іншых гаспадарчых суб'ектаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Студэнты змогуць вывучаць мову ўрду

Пагадненне аб узаемным прызнанні дакументаў аб адукацыі падпісана паміж урадамі Беларусі і Пакістана. Аб гэтым паведамляе прэс-служба Міністэрства адукацыі нашай краіны.

Акрамя таго, падпісана Пагадненне паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Міністэрствам федэральнай адукацыі і прафесійнага навучання Ісламскай Рэспублікі Пакістан аб супрацоўніцтве ў сферы адукацыі, а таксама шэраг пагадненняў паміж ВНУ.

Беларусь і Пакістан будуць развіваць адукацыйнае супрацоўніцтва паміж Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, БДУ і Акадэміяй дыпламатычнай службы Пакістана, БДУ і Універсітэтам Каіды-і-Азам, БДУ, БДУІР і Інстытутам інфармацыйных тэхналогій Пакістана, БДУІР і Нацыянальным універсітэтам навукі і г.д.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Ну і ну!

На фальшывыя грошы купіў дзяўчыне абутак

У міліцыю звярнулася жанчына, якая расказала, што малады чалавек набыў у яе дзве пары абутку, а расплаціўся фальшывымі грашыма. Праўда, засумнявалася жанчына ў сапраўднасці купюр толькі дома.

На працягу некалькіх гадзін хлопец быў затрыманы. Па інфармацыі Маскоўскага РУУС г. Мінска, ім аказаўся 22-гадовы жыхар Гомеля. Малады чалавек патлумачыў, што на такі адчайны крок ён пайшоў дзеля... сваёй дзяўчыны, якой паабяцаў купіць дзве пары абутку. Тавар, які прывезла знаёмая дзяўчыны, ён атрымаў у Мінску і расплаціўся за яго фальшывымі грашыма (7 купюр наміналам 50 дэнамінаваных рублёў). Затрыманы прызнаўся, што надрукаваў грошы самастойна дома, падчас следчых дзеянняў былі выяўлены і канфіскаваны ў якасці рэчыўных доказаў злачыннай дзейнасці капіравальная машына, аргтэхніка, прынтар і падрыхтаваныя для вырабу купюр лісты з надрукаванымі фальшывымі 50-рублёвымі купюрамі. Маладому чалавеку можа пагражаць да 7 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

Валацуга з элегантнай сумкай

Такое нелагічнае спалучэнне адразу прыцягнула ўвагу дарожнага патруля. А калі чалавек літаральна пабег цераз пераход на чырвоны сігнал святлафора, супрацоўнікі міліцыі зразумелі, што трэба затрымліваць. І як высветлілася, не памыліліся — расказала супрацоўніца Брэсцкага абласнога ўпраўлення ДАІ Наталля САХАРЧУК.

Чалавек гэты аказаўся асобай без пастаяннага месца жыхарства, знешні выгляд быў таму красамоўным сведчаннем, а вось элегантная дамская сумка яму мала пасавала. Ды ён і не стаў адпірацца, калі прывезлі для разбору ў Маскоўскі РАУС Брэста. Сумленна расказаў, што маёмасць украў, а скарыстацца чужым не паспеў. У сумцы побач з кашальком ды іншымі рэчамі знаходзіўся мабільны тэлефон, таму гаспадыню знайшлі хутка.

Злодзей затрыманы. Адсутнасць пастаяннага месца жыхарства, як вядома, не вызваляе ад крымінальнай адказнасці.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

■ Здарэнні

СТРЭЛЫ Ў ЛЕСЕ

У інтэрнэце з'явіліся ролікі і паведамленні аб выкраданні мужчыны з Маларыцкага раёна, якое быццам бы здзейснілі пад пагрозай невядомыя. Вось што паведаміў з гэтай нагоды начальнік аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў Брэсцкага абласнога УУС Сяргей ДУЧЭНКА:

— Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Брэсцкага РАУС і палка ППСМ УУС у прыватным доме вёскі Арлянка Маларыцкага раёна затрымалі 55-гадовага мужчыну. Ён знаходзіўся ў міждзяржаўным вышуку па абвінавачванні ў здзяйсненні насілля ў адносінах да супрацоўніка органаў унутраных спраў.

У час яго канваіравання ў Брэст аўтамабілі знаёмых і сваякоў сталі перашкаджаць руху службовага аўтамабіля. На сірэну, праблескавыя маячкі, а таксама патрабаванне ўступіць дарогу вадзіцелі не рэагавалі. Для спынення транспарту аднаго з правапарушальнікаў супрацоўнік міліцыі выкарыстаў зброю. Ён выстраліў у паветра, але вадзіцель не зрэагаваў. Затым міліцыянер выстраліў у правае задняе кола і тым самым прымусіў машыну спыніць рух.

На месца здарэння прыбыла аператыўна-следчая група. Усе ўдзельнікі канфлікту ўстаноўлены. Зараз з імі працуюць следчыя СК, заведзена крымінальная справа.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

НЕБЯСПЕЧНЫЯ ЗАКЛАДКІ «ГРУЗЧЫКА»

Нарадам Кастрычніцкага (г. Мінска) Дэпартамента аховы, які нёс службу ў раёне вуліцы Асаналіева, затрыманы 23-гадовы раней не судзімы жыхар сталіцы, які займаўся распаўсюджваннем асабліва небяспечнага псіхатропа.

Увагу супрацоўнікаў міліцыі прыцягнуў малады чалавек, які хадзіў ад пад'езда да пад'езда і капаўся ў зямлі. Заўважыўшы дзіўныя паводзіны хлопца, супрацоўнікі міліцыі затрымалі яго. У ходзе асабістага вобыску ў мінчаніна было канфіскавана 10 грамаў асабліва небяспечнага псіхатропнага рэчыва, расфасаванага па пакецiках, абматаных ізастужкай. Хлопец паказаў месцазнаходжанне яшчэ 20 закладак, якія ён паспеў зрабіць. Акрамя гэтага, у мабільным тэлефоне затрыманага знойдзены тэкставы файл з месцамі закладак.

Паводле інфармацыі Кастрычніцкага РУУС г. Мінска, па месцы жыхарства фігуранта канфіскавана нерасфасаванае парашкападобнае рэчыва масай 65 грамаў, электронныя вагі і іншае, неабходнае для фасоўкі дробных партый забароненых рэчываў і далейшай іх рэалізацыі шляхам закладак. Таксама ў кватэры затрыманага былі знойдзены грошы ў суме 1300 рублёў і багатая калекцыя нажоў.

Затрыманы раслумачыў, што ўладкаваўся рабіць закладкі ў канцы ліпеня, працаваў на інтэрнэт-краму. Атрымліваў у пастаўшчыкоў па 100 грамаў псіхатропнага рэчыва, фасаваў і раскладваў дробнымі закладкамі. Пры гэтым сам наркотыкі не ўжываў. Маці затрыманы расказваў, што па начах працуе грузчыкам. Маладому чалавеку пагражае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі тэрмінам да 15 гадоў з канфіскацыяй маёмасці або без канфіскацыі.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

У школу — па веды...

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Парады псіхолага бацькам:

Задумайцеся, наколькі вашы патрабаванні і чаканні суадносяцца з магчымасцямі дзіцяці. Не арыентуйце яго толькі на поспехі ў школе. Лепш дапамажыце вылучыць тыя прадметы, па якіх ён здольны атрымліваць высокія адзнакі.

Калі ў дзіцяці не ладзіцца з вучобай, паспрабуйце ўстрымацца ад папрокаў і не драматызуйце школьныя няўдачы. Супакойце яго і растлумачце, што вы будзеце любіць яго незалежна ад адзнак, якія ён атрымлівае. Падтрымлівайце дзіця і ўсяляйце ўпэўненасць у тым, што ў наступны раз у яго ўсё атрымаецца.

Не варта занадта захапляцца найвышэйшымі баламі і засмучацца ад нізкіх. Не забывайцеся, што дзіця ў першую чаргу ідзе ў школу па веды, а не па адзнакі!

Больш — не заўсёды лепш

— Негатыўная гнятлівая атмасфера ў школе мае для псіхічнага і псіхалагічнага здароўя дзіцяці вырашальнае значэнне, — падкрэслівае **намеснік дырэктара Інстытута псіхалогіі БДПУ Сяргей ЖАРАБЦОЎ**. — Значэнне для эмацыянальнага стану мае ўсё: як дзіця адчувае сябе ў дзіцячым калектыве, як складваюцца яго стасункі з педагогамі, як ён успрымае вучэбны матэрыял, наколькі ўпэўнена сябе адчувае, баіцца ці не баіцца памыліцца? На жаль, але тое, што адбываецца ў класе, вызначаецца, найперш, псіхалагічным станам настаўніка. І калі кіраўніцтва школы падтрымлівае аптымізм, азарт педагога, яго нестандартныя формы работы — гэта адно, а калі ў рабоце дамінуюць нейкія фармальныя аспекты — гэта ўжо зусім іншае. Вымушаны канстатаваць, што ў сучасных школах стала зашмат фармалізму, з-за якога настаўніку няма калі думаць пра псіхалагічны стан дзяцей ці пра тое, як цікава правесці ўрок. Галоўнае — запоўніць паперкі, каб не атрымаць наганяй! Увогуле прынцып «больш — заўсёды лепш» у педагогіцы не працуе. Фактычна ў сярэдняй і старшай школе мы назіраем, як настаўнікі вядуць барацьбу за свой прадмет. Прычым кожны лічыць сваю дысцыпліну галоўнай. І разважаюць прыкладна так: чым больш я задаю на дом, тым больш дзеці будуць ведаць, а значыць, і паспяховасць у іх будзе лепшая. Гэта вялікая памылка!

Вельмі шмат залежыць і ад асобы настаўніка. Страх перад педагогам — стрэс, які губіць дзіця. Прырода стрэсу можа быць рознай. Калі дзіця чымсьці захоплена, нават той жа матэматыкай, то гэта пазітыўны стрэс. А калі школьнік да ночы завісае над хатнім заданнем па адным прадмеце, то гэты стрэс для яго разбуральны. Трэба ўводзіць хранаметраж хатніх заданняў, якія задаюцца вучням у сярэдняй і старшай школе. І прыводзіць іх аб'ёмы ў адпаведнасць з узроставымі і фізіялагічнымі магчымасцямі дзіцяці.

Але, як высвятляецца, аб'ёмы хатніх заданняў знаходзяцца цалкам на сумленні настаўнікаў. Колькі задач, параграфаў, практыкаванняў павінен зрабіць школьнік — вырашае толькі педагог. Напрыклад, адзін настаўнік можа даць заданне — падрыхтаваць прэзентацыю, другі — прачытаць вялікі тэкст па літаратуры ці вывучыць верш, трэці — самастойна праштудзіраваць матэрыял, які не паспелі разам прайсці на ўроку. І ўсё гэта падае на галаву аднаго дзіцяці. А калі напярэдзе выхадныя, то і аб'ёмы заданняў таксама павялічваюцца. І гэта пры тым, што ў многіх еўрапейскіх краінах хатнія заданні на суботу-нядзелю ніколі не задаюць.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Вуснае ацэньванне або адзнакі?

Начальнік арганізацыйна-аналітычнага ўпраўлення Нацыянальнага інстытута адукацыі Лілія КУЗНЯЦОВА лічыць бясспрэчным дасягненнем нашай сістэмы адукацыі ўвядзенне ў пачатковай школе безадзнакавага навучання. На дадзены момант увогуле без адзнак навучаюцца вучні першых і другіх класаў. А ў трэціх і чацвёртых — не выстаўляюцца адзнакі па «выяўленчым мастацтве», «працоўным навучанні», «музыцы» і «фізічнай культуры». У сярэдніх класах таксама не выстаўляюцца адзнакі па прадметах «Айчынная і сусветная мастацкая культура» і «Асновы бяспекі жыццядзейнасці».

Аб'ёмы хатніх заданняў знаходзяцца цалкам на сумленні настаўнікаў.

Трэба патлумачыць, што пры безадзнакавым навучанні ў пачатковай школе праца дзіцяці ацэньваецца не ў балах, а ў выглядзе разгорнутага ацэначнага суджэння, якое дае педагог. Таму гуманістычны патэнцыял такой ацэнкі намнога вышэйшы. Да таго ж безадзнакавае навучанне дазваляе дзецям не бачыць адзін у адным «выдатнікаў» і «двоечнікаў», «сераднячкоў» і «харашыстаў». Пасля завяршэння эксперымента па апрабацыі безадзнакавага навучання вучняў трэціх і чацвёртых класаў, які праводзіўся ў 2008—2012 гадах, была зроблена выснова, што навучэнцы якасна засвойваюць змест урокаў, у іх паніжаны ўзровень трывожнасці, яны не баяцца памыліцца, і, самае галоўнае, у гэтых навучэнцаў сфарміраваліся ўнутраныя матывы да вучэбнай дзейнасці.

«У некаторых еўрапейскіх краінах безадзнакавае навучанне практыкуецца да сёмага класа, і калі б вырашэнне гэтага пытання залежала ад мяне, я таксама распаўсюдзіла б яго і на старэйшыя класы, — канстатуе Лілія Кузняцова. — Але за выстаўленне адзнак сваім дзецям выступаюць бацькі, прычым многія жадаюць, каб зразумелыя ім адзнакі пачалі выстаўляць ужо ў першым класе».

Загадчыца лабараторыі праблем здароўя дзяцей і падлеткаў РНПЦ «Маці і дзіця» Маргарыта ДЗЕВЯЛТОЎСКАЯ паведаміла, што медыкі часта сутыкаюцца з дзецьмі, якія ў сям'і атрымліваюць моцную ўстаноўку на лідарства. Гэта адбываецца яшчэ да пачатку школьнага жыцця, але ў кожнага — свае інтэлектуальныя і эмацыянальныя магчымасці і здольнасці, і калі раптам высвятляецца, што дзіця ў вучобе не адпавядае чаканням бацькоў, у яго адбываецца неўратызацыя. Такія дзеці бясконца вучацца, нават па начах, моцна перажываюць, калі атрымліваюць «дзявятку». Ёсць дзеці, якія вучацца толькі для таго, каб парадаваць сваіх бацькоў, яны баяцца сустрэць неадабрэнне з боку маці ці бацькі, баяцца быць «адбракаванымі». Даволі істотная колькасць зваротаў да школьнага псіхолага звязана менавіта з ацэначна-адзнакавай дзейнасцю.

— Трэба слухаць і чуць сваіх дзяцей. І калі дзіця ўжо на трэці дзень вучобы ў першым класе кажа, што не хоча ісці ў школу, трэба сесці з ім і паразмаўляць, даведацца пра прычыны, знайсці матывы, — папярэджвае Лілія Кузняцова. — Інакш усе адзінаццаць гадоў вучобы могуць ператварыцца для яго ў пакуты. Бацькам трэба рабіць выбар паміж здароўем дзяцей і імкненнем даць ім адукацыю любой цаной. Яны не павінны прад'яўляць да свайго дзіцяці завышаныя патрабаванні. Трэба адэкватна ацэньваць яго магчымасці.

Будзь у курсе!

Даследаванні, праведзеныя ў Вялікабрытаніі, даказваюць, што для лепшай разумовай актыўнасці ў школу трэба хадзіць пешшу. А транспартная апека бацькоў дрэнна адбіваецца на вучобе дзяцей.

Таксама брытанскія навукоўцы сцвярджаюць, што некалькі глыткоў вады, зробленых падчас разумовага напружання, здымаюць стомленасць і дапамагаюць пры галаўным болі. Таму ў школах Вялікабрытаніі дзеці кожны дзень атрымліваюць бутэлькі з пітной вадой і ім дазволена піць яе на ўроках.

Школьная дыета — супраць сямейных традыцый

Трэба мець на ўвазе, што нават той жа гастрыт часта мае псіхасаматычную прыроду. Але медыкі катэгарычна нязгодныя са сцвярджэннем, што дзеці «зарабляюць» гастрыт у школе. І прыводзяць у якасці доказу наступныя аргументы: калі ў 2006 годзе захворванні страўнікава-кішачнага тракту займалі ў структуры дзіцячай захваральнасці другое месца, то сёння яны перамясціліся на пятае-шостае месца ва ўсіх узроставых групах дзіцячага насельніцтва. Маргарыта Дзевялтоўская лічыць, што гэта заслуга, найперш, школьнага харчавання, таму што мадэль сямейнага харчавання вельмі часта «кульгае» — менавіта па прычыне нездаровых традыцый у харчаванні, якія ўласцівыя многім сем'ям, усё часцей у дзяцей і падлеткаў дыягнастуецца метабалічны сіндром. Павышэнне артэрыяльнага ціску і ўзроўню глюкозы ў крыві, залішняя вага цела — найвастрэйшыя праблемы для падрастаючага пакалення.

— Перавага школьных абедаў — у іх дыетычным характары: адсутнасці камбітлушчоў (усё для дзяцей гатуецца толькі на сметанковым масле), вырабаў у фрыцюры, касцяных булёнаў, вострых прыправаў (такіх, як перац і хрэн), а таксама воцату і прадуктаў з яго выкарыстаннем, тлустых гатункаў мяса, — падкрэслівае **загадчыца аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ала МАЛАХАВА**. — Да таго ж у дзіцячым харчаванні выкарыстоўваюцца зберагальныя метады апрацоўкі ежы — тушэнне, варэнне, гатаванне на пару. Акрамя таго, забаронена выкарыстанне шкодных для здароўя прадуктаў — чыпсаў, салодкіх газаваных напояў, закусачных агароднінных і рыбных кансерваў. Харчавацца дзецям трэба 4—5 разоў на дзень. Ці многія з бацькоў забяспечваюць сваім дзецям рэгулярнае і рацыянальнае харчаванне?

Марш за канторку!

Сур'ёзнай праблемай для падрастаючага пакалення з'яўляецца і гіпадынамія. Недастатковая рухальная актыўнасць не задавальняе біялагічныя патрэбы дзіцяці, якое расце, і, як вынік, яго арганізм не насычаецца як след кіслародам. Праблему дэфіцыту рухальнай актыўнасці дзяцей не могуць вырашыць і школьныя ўрокі фізкультуры, паколькі адзін урок задавальняе патрэбу дзіцяці ў рухальнай актыўнасці толькі на 11%.

Сур'ёзна церпіць за гады навучання ў школьнікаў і зрок: калі ў 2006 годзе праблемы з ім назіраліся ў 9 працэнтаў школьнікаў, то ў 2015 годзе іх доля дасягнула ўжо 14 працэнтаў. А вось з паставай сітуацыя палепшылася: у апошнія гады доля дзяцей з адхіленнямі ў развіцці пазваночніка трымалася на ўзроўні 8% (у 2006 годзе было 9%). Галоўную ролю ў гэтым адыграла змена мэблі ў школах: замест сталоў у пачатковых класах цяпер выкарыстоўваюцца парты. Гэта больш «здаровая» мэбля, якая рэгулюецца і дапамагае правільна вытрымліваць адлегласць паміж сталом і вучнем падчас работы. Плюс у пачатковай школе ў класных пакоях з'явіліся канторкі, якія вонкава нагадваюць кафедру. Яны дазваляюць дзецям падчас навучальнага працэсу займацца стоячы і знімаць статычнае напружанне. Гэта важна для прафілактыкі парушэнняў у касцёва-мышачнай сістэме, пры ўзнікненні скаліёзу і парушэнняў паставы. Выкарыстанне канторак станоўча адбіваецца і на зроку, таму што дзіця, карыстаючыся такой мэбляй, глядзіць на напісанае на дошцы, але з іншай адлегласці, паколькі яны размяшчаюцца ў класе або недзе ззаду, або збоку, але такім чынам, каб не перашкаджаць іншым вучням. Знаходзіцца за канторкай можна пры жаданні ад пяці да пятнаццаці хвілін. Патрапіць туды можна як па ўласным жаданні, так і па запрашэнні настаўніка. Вось толькі медыкі заўважаюць, што ў некаторых школах настаўнікі выкарыстоўваюць канторкі як падстаўкі для кветак. Мякка кажучы, не зусім па іх прызначэнні...

Ёсць у медыкаў і прэтэнзіі да падрыхтоўкі будучых настаўнікаў. Яны лічаць, што маладыя педагогі маюць вельмі цьмянае ўяўленне пра тое, як граматна ў класе рассаджваць дзяцей, пра многія псіхалагічныя аспекты, у тым ліку і пра аб'ёмы хатніх заданняў, якія павінны адпавядаць фізіялагічным магчымасцям іх вучняў.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

■ Класныя навіны

Бясплатная альтэрнатыва рэпетытарству

«Школы юных» адкрываюць новы адукацыйны сезон у Беларускім дзяржаўным універсітэце.

У гэтым годзе да вялікай універсітэцкай сям'і «Школ юных» далучыліся «Школа юнага хіміка» і «Школа будучага лагістаміжнародніка». Слухачамі «Школы юнага хіміка» могуць стаць вучні 7—11 класаў агульнаадукацыйных школ, ліцэяў і гімназій. У «Школу будучага лагіста-міжнародніка», якая дзейнічае на факультэце міжнародных адносін, запрашаюць вучняў 10—11 класаў. Галоўная яе задача заключаецца ў прафесійнай арыентацыі абітурыентаў, якія плануюць кар'еру ў сферы міжнароднай лагістыкі. Таксама на ФМА адзінаццацікласнікі могуць прайсці навучанне ў «Школе будучага мытніка».

Нагадаем, што ў вядучай ВНУ краіны працуюць школы юных біёлагаў (для вучняў 9—11 класаў), географаў, геолагаў і краязнаўцаў (для вучняў 7—11 класаў), вочна-завочная фізіка-матэматычная школа пры фізічным факультэце (для вучняў выпускных класаў), «Школа юнага матэматыка» пры механіка-матэматычным факультэце (для вучняў 5—11 класаў), «Школа юных матэматыкаў і інфарматыкаў» у «ЮНІЦэнтр-XXI» і вочна-завочная школа па матэматыцы і інфарматыцы для вучняў 5—11 класаў пры факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі.

Вучняў 6—11 класаў запрашае «Школа юных гісторыкаў» пры гістарычным факультэце, а вучняў 9—11 класаў — «Школа юнага філосафа» на факультэце філасофіі і сацыяльных навук.

А «Школа радыёфізіка» пры факультэце радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій і «Школа маладога журналіста» пры Інстытуце журналістыкі разлічаны на адзінаццацікласнікаў.

Для таго каб ахапіць школьнікаў з усіх рэгіёнаў краіны, БДУ таксама актыўна пашырае сваю адукацыйную прысутнасць у сетцы інтэрнэт. У ВНУ працуюць дыстанцыйныя курсы для старшакласнікаў па паглыбленым вывучэнні гісторыі і матэматыкі.

Навучанне ва ўсіх «Школах юных» — бясплатнае.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■ 50+: Жыць цікава

ЖАНЧЫНА — СОЛА

Рыжанка, якая жыве цяпер у Мінску, — пра нас і пра сябе

Гераіня гэтага артыкула — 60-гадовая Аніта Санэ з Рыгі, якая ўжо два гады жыве і працуе ў Мінску. Жанчына аб'ездзіла больш за 50 краін, пабывала на ўсіх кантынентах, акрамя Паўднёвай Амерыкі: у Еўропе, Азіі, Аўстраліі, Новай Зеландыі... Апроч саміх падарожжаў Аніта вядзе блог і інстаграм, прысвечаныя ім. У апошні час у яе шмат запісаў і фатаграфій, у якіх яна ўсяму свету расказвае пра Беларусь.

Гэты здымак Аніты Санэ — візітоўка яе сайта.

«Я, якая вандруе па свеце ў адзіночку»

Аніта прыехала ў Мінск у 2014 годзе, пасля таго як атрымала працоўны кантракт у чэшскай фірме, філіял якой знаходзіцца ў Мінску. Яна — дырэктар па персанале. Яе асабісты сайт мае слоган «solo female travel website», г.зн. ён — аб падарожжах жанчыны-сола — у адзіночку. «Люблю незалежнасць і свабоду, — тлумачыць наша суразмоўніца. — І я — самадастатковая асоба. Вядома, жывучы сола, нешта губляеш, але і знаходзіш таксама. Да таго ж у мяне заўсёды ёсць чым заняцца, такое мноства ідэй і праектаў, што нават не хапае часу на ўсё!»

Свой сайт Аніта стварыла ў лістападзе мінулага года, каб весці блог пра падарожжы. Вядома, гэтаму трэба было спачатку навучыцца. «Першы час было складана, — успамінае Аніта. — І я, вядома, не навучылася прафесійна праграмаваць, але сама зрабіла свой сайт і цяпер пішу і публікую ў ім свае артыкулы і фатаграфіі, магу стварыць новы раздзел, калі спатрэбіцца. А калі з'яўляецца задача, з якой я не магу справіцца, тэлефаную выкладчыцы, якая мяне вучыла, і бяру дадатковыя ўрокі».

Навошта Аніце блог, работа з якім адбірае вельмі шмат часу? Справа ў тым, што яна так многа падарожнічала і працягвае гэта рабіць, што ў рэшце рэшт захацела падзяліцца сваімі ўражаннямі, расказаць пра іх іншым людзям. «Мой моцны бок — планаванне, я заўсёды дакладна планую кожную сваю паездку. І падумала: мае маршруты могуць быць цікавымі, могуць спатрэбіцца іншым людзям», — кажа яна. Цяпер Аніта мае зносіны з трэвелблогерамі (людзьмі, што пішуць у блогах пра свае падарожжы) з усяго свету ў сацыяльных сетках. «Я шмат чаму навучылася за апошні год і вельмі рада гэтаму», — кажа наша гераіня.

Акрамя блога, яна яшчэ вядзе інстаграм. Выкладвае туды фатаграфіі і «прывязвае» да іх свае гісторыі. І блог, і інстаграм у Аніты на англійскай мове. Яна добра размаўляе на ёй, але гаварыць і пісаць — гэта розныя рэчы, тым больш для публікі, для якой англійская мова з'яўляецца роднай і якая заўважае любыя агрэхі. Таму прыйшлося дадаткова падцягваць мову. Вядома, гэта патрабуе часу. Затое цяпер у яе 12 600 падпісчыкаў і чытачоў з усяго свету, якім цікавыя яе фота — гэта ўжо дастаткова сур'ёзны ўзровень. Напрыклад, напярэдадні нашай гутаркі Аніта выклала ў інстаграме здымак Нясвіжскага палаца, і 538 чалавек з розных краін адзначылі, што ім падабаецца гэта фота.

«Да Мінска мне здавалася, што Рыга вельмі дагледжаны горад»

Да прыезду ў Мінск два гады таму Аніта была ў Беларусі ўсяго адзін раз, яшчэ за савецкім часам. Кажа, што ў памяці засталіся шырокія вуліцы нашай сталіцы.

— Зараз я магу адзначыць тое, што, напэўна, адзначаюць усе замежнікі, якія пабывалі ў Беларусі — чысціню і парадак, — расказвае яна. — Цяпер, калі я прыязджаю ў Рыгу, адразу бачу: вось тут трава не пакошана, там будынак не пафарбаваны... А да Мінска мне здавалася, што Рыга вельмі дагледжаны горад, што ў нас усюды парадак. Але ў параўнанні з вашай сталіцай я бачу, што гэта не зусім так. У нас больш кантрастаў, бо на ўсё прыватная ўласнасць. У кагосьці з уладальнікаў ёсць сродкі на догляд за домам і падтрыманне яго ў парадку, а ў кагосьці — няма. Таму ў Рызе побач з дагледжаным будынкам можа знаходзіцца будынак у трохі занядбаным стане. А ў вас у роўнай ступені ўсё дагледжана. Прычым я шмат езджу па Беларусі і бачу, што ўсюды парадак, а не толькі ў цэнтры сталіцы. І гэта мяне здзіўляе. Гэта тое, што адразу кідаецца ў вочы...

Так, цяпер Аніта шмат падарожнічае па Беларусі. Тлумачыць: «Мне цікава глыбей зразумець краіну, дзе я цяпер жыву». Як і ў падарожжах па ўсім свеце, так і тут яна ніколі не ездзіць з турыстычнымі групамі, толькі адна: «Гэта мой спосаб падарожнічаць».

— У вашай краіны вельмі складаная гісторыя — столькі сутыкненняў, войнаў і падзелаў тут было! — кажа наша суразмоўніца. — Нядаўна я была ў Трасцянцы — яшчэ адна вельмі цяжкая старонка ў вашай гісторыі, якая ілюструе трагедыю габрэйскага народа. Зараз я рада, што ў вас аднаўляюцца сінагогі. Дарэчы, я ўпершыню ў жыцці пабывала ў сінагозе менавіта ў вас, у Гродне... А на днях я была на пешаходнай экскурсіі па Мінску, і самае вялікае ўражанне на мяне зрабіў той факт, што былі часы, калі ў горадзе ўсе надпісы былі на чатырох мовах: беларускай, рускай, польскай і ідыш!

«У вас ёсць шмат таго, што варта ўбачыць, — кажа Аніта, але наракае на вялікія адлегласці. — Беларусь — вялікая краіна, і трэба лічыцца з тым, што, каб нешта паглядзець, трэба выдаткаваць шмат часу на дарогу». А першыя месцы, з якіх яна пачала знаёмства з нашай краінай — гэта традыцыйныя Мір і Нясвіж. На іх конт у Аніты сваё меркаванне.

— Гэтыя месцы маюць доўгую гісторыю. І заўсёды ёсць пытанне, які час мы хочам «вярнуць»: 200 гадоў таму або 300, а можа, 100... Бо ў розныя часы гістарычныя месцы былі рознымі... — разважае Аніта. — Які час мы выбіраем для аднаўлення? Мяне гэтая тэма заўсёды цікавіла. Тут можа быць шмат спрэчак... Асабіста для мяне важна ў такіх месцах адчуць дух часу, павінна прысутнічаць пачуццё сапраўднага. Таму што пры рэстаўрацыі можна крыху перастарацца і зрабіць трохі прыгажэй, чым было. У Нясвіжы самае вялікае ўражанне на мяне зрабіў не палац, а магільны склеп роду Радзівілаў у Фарным касцёле — таму што там у мяне было пачуццё сапраўднага...

Пра Мірскі замак Аніта кажа, што такога нідзе не бачыла: «Ён вельмі асаблівы па сваёй архітэктуры, унікальны. Я пабывала больш чым у 50 краінах, шмат чаго бачыла, мне ёсць з чым параўнаць»...

«Я заўсёды дакладна планую кожную сваю паездку. І падумала: мае маршруты могуць быць цікавымі, могуць спатрэбіцца іншым людзям».

Яна з захапленнем расказвае пра сваю апошнюю паездку, якая была ў брэсцкім напрамку: «Я знайшла ў інтэрнэце здымкі Косава і вельмі захацела ўбачыць гэты палац ужывую. Там яшчэ ідзе рэканструкцыя, але тое, што зроблена, ужо ўражвае! Гэта надзіва прыгожы палац, мяне ён вельмі ўразіў».

«Ёсць толькі адна Радзіма — свая»

У Мінску Аніта не плануе заставацца назаўсёды. «Дзе б я ні была, я добра ўсведамляю, што ёсць толькі адна Радзіма — свая краіна. У любой іншай, нават самай прыгожай, якая табе вельмі падабаецца, ты ўсё роўна будзеш чужым». І хоць Аніта сама і дзве яе дачкі жывуць у іншых краінах (адна — у Швецыі, другая — у Аўстраліі), жанчына адзначае, што ў яе ўвесь час прысутнічае пачуццё, дзе яе сапраўдны дом, і ён — у Латвіі. «Сваім ты будзеш толькі ў сваёй краіне, у іншай ты застанешся госцем, — кажа яна. — Для мяне гэта даўняя ісціна».

Святлана БУСЬКО.
busko@zviazda.by

У пустыні ў Аб'яднаных Арабскіх Эміратах.

БелВЭБ

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2016 года

Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	на 01.10.2016	на 01.10.2015
1	2	3	5	6
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	64 914	57 483
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	606	453
4	Средства в Национальном банке	1103	116 360	123 032
5	Средства в банках	1104	240 483	346 544
6	Ценные бумаги	1105	889 789	484 104
7	Кредиты клиентам	1106	2 341 389	2 168 328
8	Производные финансовые активы	1107	12	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	10 044	5 580
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	181 543	154 112
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	2 753	1 340
12	Отложенные налоговые активы	1111	11	-
13	Прочие активы	1112	35 512	34 297
14	ИТОГО активы	11	3 883 416	3 375 273
15	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
16	Средства Национального банка	1201	12 834	2 928
17	Средства банков	1202	1 716 652	1 551 402
18	Средства клиентов	1203	1 665 594	1 394 709
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	2 671	2 750
20	Производные финансовые обязательства	1205	-	-
21	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
22	Прочие обязательства	1207	43 333	32 884
23	ВСЕГО обязательства	120	3 441 084	2 984 673
24	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
25	Уставный фонд	1211	117 408	117 408
26	Эмиссионный доход	1212	-	-
27	Резервный фонд	1213	47 446	42 027
28	Фонд переоценки статей баланса	1214	73 437	66 602
29	Накопленная прибыль	1215	204 041	164 563
30	ВСЕГО собственный капитал	121	442 332	390 600
31	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	3 883 416	3 375 273

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 9 месяцев 2016 года

Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	за 9 месяцев 2016 года	за 9 месяцев 2015 года
1	2	3	5	6
1	Процентные доходы	2011	309 688	260 617
2	Процентные расходы	2012	156 820	144 111
3	Чистые процентные доходы	201	152 868	116 506
4	Комиссионные доходы	2021	66 160	58 192
5	Комиссионные расходы	2022	20 857	18 235
6	Чистые комиссионные доходы	202	45 303	39 957
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	650	1 035
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	96	543
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	10 715	48 727
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	137	702
11	Чистые отчисления в резервы	207	68 948	80 082
12	Прочие доходы	208	6 099	11 907
13	Операционные расходы	209	91 985	74 747
14	Прочие расходы	210	4 764	5 054
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	50 171	59 494
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	3 691	11 309
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	46 480	48 185

Председатель Правления Н.В.Лузгин

Главный бухгалтер Л.А.Филиппова

Дата подписания 04 октября 2016 года

Бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на сайте www.belveb.by в разделе «О банке / Финансовые показатели деятельности банка / Квартальная финансовая отчетность / Квартальная финансовая отчетность за 2016 год, составленная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь».

ОАО «Банк БелВЭБ». Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27.12.2013 №6. УНП 100010078.

■ Энергетыка

ЗАХАВАЦЬ ГРАНІЧНА НІЗКІЯ ТАРЫФЫ ДЛЯ НАСЕЛЬНІЦТВА

На XXI Беларускім энергетычным і экалагічным форуме вызначаліся прыярытэты ў развіцці энергасістэмы да 2020 года

Апошнія дамоўленасці з Расіяй па газе дапамогуць у далейшым зніжаць тарыфы для рэальнага сектара эканомікі, паведаміў міністр энергетыкі Беларусі Уладзімір ПАТУПЧЫК на пленарным пасяджэнні Беларускага энергетычнага і экалагічнага форуму.

У прыватнасці ён адзначыў, што «з улікам прынятага рашэння і падпісанага пратакола адкрываюцца выдатныя перспектывы па далейшым зніжэнні выдаткаў і тарыфаў для рэальнага сектара эканомікі». Паводле разлікаў Мінэнерга, пры кошце газу 117 долараў за 1 тысячу кубічных метраў можна забяспечыць прымальныя тарыфы для рэальнага сектара эканомікі пры захаванні гранічна нізкіх тарыфаў на цеплавую і электрычную энергію для насельніцтва. «Пры гэтым 117 долараў за 1 тысячу кубаметраў — гэта ў 2 разы вышэй, чым цана газу для расійскіх энергетыкаў, што сведчыць аб велізарным запасе трываласці беларускай энергасістэмы», — падкрэсліў Уладзімір Патупчык.

Выключна ўласная электрычнасць

Больш таго, міністр паведаміў, што наша краіна з 2019 года цалкам адмовіцца ад імпарту ў балансе электраэнергіі. Яшчэ зусім нядаўна мы імпартавалі да 7 млрд кВт·гадз, што складала значную долю ў спажыванні электраэнергіі ўнутры краіны. Энергетыкі адзначаюць, што за апошнія гады імпарт электраэнергіі зніжаны амаль у тры разы — з 7,9 млрд кВт·гадз у 2012 годзе да 2,8 млрд кВт·гадз у 2015 годзе.

Паводле слоў міністра, праведзеная мадэрнізацыя беларускай энергасістэмы дае магчымасць штогод эканоміць каля 150 млн кубаметраў імпартуемага прыроднага газу, што эквівалентна 24 млн долараў. Вынікам рэалізацыі энергаэфектыўных праектаў таксама стала зніжэнне выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасферу, у тым ліку дыяксіду серы больш чым у два разы і аксіду азоту амаль у 1,5 раза.

Мясцовыя віды паліва і «ветракі»

Уладзімір Патупчык таксама звярнуў увагу, што ў Беларусі расце доля выкарыстання аднаўляльных крыніц энергіі. Калі ў 2011 годзе сумарная ўстаноўленая магутнасць ветраэнергетычных установак складала 1,6 МВт, то ў 2016 годзе эксплуатуецца 68 такіх установак магутнасцю 59,3 МВт. Летась гэтымі ўстаноўкамі пастаўлена ў агульную энергасетку краіны 38,4 млн кВт·гадз электраэнергіі, што дазволіла замясціць 8,7 млн «кубоў» прыроднага газу і скараціць выкіды забруджвальных рэчываў на 19,2 тысячы тон.

Ужо сёлета ў Навагрудскім раёне Гродзенскай вобласці запушчана адна з найбуйнейшых у краіне ветраэнергетычных станцый. Яе работа дапаможа энергасістэме штогод эканоміць каля 5 млн «кубоў» газу і скараціць выкіды забруджвальных рэчываў дадаткова на 10,9 тысячы тон у год.

Міністр адзначыў, што паспяхова развіваецца ў краіне і тарфяная галіна. Запланавана, што да 2020 года торфапрадпрыемствы значна павялічаць здабычу торфу для вытворчасці брыкетаў і тарфяной сушанкі (фрэзерны торф). Цяпер прапрацоўваецца магчымасць стварэння энергакрыніц з выкарыстаннем тарфянога паліва на аб'ектах ЖКГ Мінскай і Гродзенскай абласцей.

Запуск АЭС скароціць імпарт газу

«Пасля рэалізацыі ў 2016—2020 гадах дзяржаўных праектаў у структуры вызначанай магутнасці аб'яднанай энергасістэмы доля энергакрыніц, якія працуюць на прыродным газе, знізіцца да 2021 года з 97% да 70-75%», — паведаміў Уладзімір Патупчык. Энергетычная палітыка ў найбліжэйшай перспектыве будзе накіравана на зніжэнне тарыфаў і ўдзельных выдаткаў на выпрацоўку энергіі.

Галоўнымі прыярытэтамі ў развіцці энергасістэмы да 2020 года будзе запуск Беларускай АЭС магутнасцю 2400 МВт, увод высокаэфектыўных генерыруючых магутнасцяў каля 350 МВт, рэалізацыя мерапрыемстваў па інтэграцыі атамнай станцыі ў баланс энергасістэмы і развіццё электрасетак. У найбліжэйшай пяцігодцы прадугледжаны праекты па выкарыстанні мясцовых відаў паліва. Напрыклад, на Мазырскай ЦЭЦ прапрацоўваецца ўстаноўка катлаагрэгата магутнасцю 150 МВт з выкарыстаннем тарфянога паліва, завяршаецца будаўніцтва Полацкай і Віцебскай ГЭС сумарнай магутнасцю больш за 60 МВт. Рэалізацыя праектаў, прадугледжаных галіновай праграмай развіцця электраэнергетыкі на 2016—2020 гады, дасць магчымасць дасягнуць эканоміі паліўных рэсурсаў да 850 тысяч тон умоўнага паліва.

Гаворачы аб будаўніцтве АЭС, Уладзімір Патупчык звярнуў увагу, што вытворчасць электраэнергіі на станцыі ў базавым рэжыме складзе каля 18 млрд кВт·гадз у год. Уласная атамная электрастанцыя дасць магчымасць штогод замяшчаць каля 5 млрд «кубоў» прыроднага газу. Выкіды парніковых газаў знізяцца на 7—10 млн тон у год. «Развіццё атамнай энергетыкі — гэта новы інтэлектуальны і тэхналагічны імпульс у развіцці краіны і забеспячэнні дадатковых гарантый умацавання незалежнасці і эканамічнай самастойнасці», — упэўнены міністр.

XXI Беларускі энергетычны і экалагічны форум працаваў у Мінску 11—14 кастрычніка. Праграма форуму ўключала пленарнае пасяджэнне, міжнародныя канферэнцыі, навукова-практычныя семінары і прэзентацыі кампаній-удзельнікаў выставы.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

■ Сітуацыя

ЧАМУ НАШЫ ЛІФТЫ НЕ ЕДУЦЬ У РАСІЮ?

У Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю паступіла інфармацыя ад Міністэрства прамысловасці Беларусі аб абмежаванні канкурэнцыі на трансгранічным рынку ліфтавага абсталявання.

Так, Міністэрствам прамысловасці і гандлю Расійскай Федэрацыі ў жніўні бягучага года быў накіраваны рэкамендацыйны ліст рэгіянальным фондам капітальнага рамонту шматкватэрных дамоў аб прыярытэтным укараненні расійскага ліфтавага абсталявання, што не дазваляе беларускім вытворцам ліфтаў пастаўляць на рынак Расіі свае апошнія распрацоўкі, у тым ліку з выкарыстаннем расійскіх матэрыялаў і камплектуючых, паведамляе прэс-служба Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю. У такога кшталту дзеяннях бачацца прыкметы парушэння артыкула 75 «Агульныя прынцыпы канкурэнцыі» Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе. У адрас Федэральнай антыманапольнай службы Расіі накіраваны ліст аб ацэнцы адпаведнасці дзеянняў Міністэрства прамысловасці і гандлю Расійскай Федэрацыі гэтаму Дагавору і Закону Расійскай Федэрацыі «Аб абароне канкурэнцыі» і прыняцці адпаведных мер.

Сяргей РАСОЛЬКА

■ З нагоды

ЛЕКІ НА ЭКСПАРТ

Фармацэўты расказалі пра перспектывы сваёй галіны

Рэнтабельнасць айчыннай фармацэўтычнай прамысловасці складае сёлета 18 працэнтаў. 25 працэнтаў фармпрадукцыі адпраўляецца на знешнія рынкі ў 29 краін, ільвіная доля экспарту прыпадае на Расію. Але экспарт ажыццяўляюць толькі чвэрць з 49 ліцэнзаваных прадпрыемстваў — галоўным чынам гэта дзяржаўныя прадпрыемствы, такія як Барысаўскі завод медпрэпаратаў, дзе экспарт складае больш за 40 працэнтаў, і «Белмедпрэпараты» — 35 працэнтаў адпаведна. За 8 месяцаў гэтага года аб'ём экспарту склаў 74 млн долараў.

У краіне зарэгістравана больш за 5 тысяч найменняў лекавых сродкаў, 32 працэнты з іх — айчынныя. Доля айчынных лекаў на ўнутраным рынку ў коштавым выражэнні — 52 працэнты. Імпарт толькі летась зменшыўся на 236 млн долараў. Забеспячэнне ўнутранага рынку было прыярытэтным у мінулую пяцігодку, а таму доля айчынных прэпаратаў вырасла ажно на 22 працэнты. У бліжэйшыя гады ў прыярытэце будзе ўжо знешні рынак, куды ў 2020-м павінна адпраўляцца 40 працэнтаў фармпрадукцыі (у коштавым выражэнні). Доля ўнутранага рынку прырасце да таго часу максімум на 5 працэнтаў. Сёння, у Дзень работнікаў фармацэўтычнай і мікрабіялагічнай прамысловасці, спецыялісты падрабязней расказваюць аб стане галіны.

— З 2011-га па 2015 год у краіне рэалізавана 25 інвестыцыйных праектаў па мадэрнізацыі і стварэнні вытворчасцяў агульным аб'ёмам інвестыцый у 195 млн долараў, — кажа **начальнік упраўлення арганізацыі вытворчасці і перспектыўнага развіцця Дэпартамента фармацэўтычнай прамысловасці Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Таццяна ТУМЕЛЯ**. — Летась было завершана 13 інвестпраектаў. На рынак выведзена за пяць гадоў 537 новых лекавых сродкаў — антыбактэрыяльных, супрацьгрыбковых, для лячэння сардэчна-сасудзістых захворванняў. Сумесна з транснацыянальнымі кампаніямі асвоена вытворчасць супрацьпухліннага сродку, імунадэпрэсанту. Сярод новых лекавых сродкаў, выведзеных на рынак у гэтым годзе, — створаная сумесна з расійскім бокам супрацьгрыпозная вакцына... Сёлета будуць завершаны інвестыцыйныя праекты па будаўніцтве корпуса прадпрыемства «Лекфарм», новага завода па вырабе супрацьпухліннага прэпарата «Націві» і новай вытворчасці лекаў у аэразолях «Фарціва мед». Налета плануецца завяршыць яшчэ сем праектаў з агульным аб'ёмам інвестыцый каля 30 млн долараў. За чатыры папярэднія гады аб'ём вытворчасці лекавых прэпаратаў вырас у 1,5 раза ў доларавым эквіваленце...

Па ацэнцы міжнародных экспертаў, стварэнне высокарэнтабельнай уласнай фармацэўтычнай прамысловасці ў краіне з насельніцтвам да 10 млн жыхароў з'яўляецца эканамічна неабгрунтаваным. «Таму ў прыярытэце — развіццё супрацоўніцтва па фарміраванні прынцыпаў і правілаў абароту лекавых сродкаў у межах Еўразійскага эканамічнага саюза, — удакладняе **начальнік упраўлення фармацэўтычнай інспекцыі і арганізацыі лекавага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Людміла РЭУЦКАЯ**. — Адпаведнае пагадненне было падпісана краінамі-ўдзельніцамі яшчэ ў 2014-м, і на яго падставе рабочая група экспертаў распрацавала на аснове лепшых міжнародных практык звыш 20 дакументаў. Гэта правілы экспертызы і рэгістрацыі, патрабаванні да маркіроўкі, сістэма належных практык і г.д. З наступнага года пачне дзейнічаць агульны рынак абароту лекавых сродкаў з адзінай рэгістрацыяй.

Працэс пераходу — да 2025 года — запатрабуе вялікіх намаганняў і фінансавых затрат, у тым ліку на падрыхтоўку і адукацыю персаналу, набыццё спецыяльнага абсталявання, якога пакуль няма ў нашай краіне. Урэшце, наваўвядзенне сэканоміць і час, і грошы фармпрадпрыемствам.

Святлана БАРЫСЕНКА
protas@zviazda.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Аукцион состоится 15 ноября 2016 года в 10.00
по адресу: 220030, г. Минск, просп. Независимости, 11/1, 2 этаж, конференц-зал.

Организатором аукциона является республиканское унитарное предприятие

«Отель «Минск»,

находящееся по адресу:
г. Минск, просп. Независимости, д. 11, корп. 1, каб. 221.

НА АУКЦИОНЕ ВЫСТАВЛЯЕТСЯ ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА:

Часть нежилого помещения №28 (вестибюль), арендуемой площадью **2,2** кв.м, на первом этаже в изолированном помещении по просп. Независимости, 11, корп. 2-2 в г. Минске; срок аренды – 3 года; начальная цена продажи – 7,48 рубля (семь рублей сорок восемь копеек); размер задатка – 0,75 рубля (ноль рублей семьдесят пять копеек); целевое использование – **для организации розничной торговли непродовольственными товарами**; ставка арендной платы за 1 кв.м – 40,80 рубля (сорок рублей восемьдесят копеек).

Документы на участие в аукционе принимаются с 17 октября 2016 года по 14 ноября 2016 года с 8.30 до 12.00, с 13.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, просп. Независимости, 11/2, каб. 232. Документы, поданные после 16.00 14 ноября 2016 года, не рассматриваются.

Порядок проведения аукциона определён Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 07 мая 2009 № 238».

Для участия в аукционе участник в срок, установленный для приема документов на участие аукционе:

- перечисляет задаток на р/с №3012000006014 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка – 795, УНП 100973184, ОКПО 37372251, РУП «Отель «Минск»;

- подает заявление на участие в аукционе;

- заключает соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;

- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:

***- физическое лицо** предъявляет документ, удостоверяющий личность;*

***- индивидуальный предприниматель** – копию свидетельства о государственной регистрации;*

***- юридическое лицо** (резидент Республики Беларусь) – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, в заявлении сообщает о нахождении на территории Республики Беларусь представительства с указанием даты выдачи Министерством иностранных дел Республики Беларусь разрешения на открытие представительства, номера и срока действия разрешения.*

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Порядок оформления участия в аукционе: лицу, допущенному к участию в аукционе, организатор аукциона выдает билет участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано.

При отсутствии у лица, желающего участвовать в аукционе, текущего (расчетного) счета в учреждении банка, он должен быть открыт до подачи заявления на участие в аукционе и указан в заявлении.

Порядок определения победителя аукциона:

- торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены и проводятся аукционистом, определяемым организатором аукциона;

- аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимает только один участник аукциона или пока не останется только один участник, предложивший наиболее высокую цену. Аукционист трижды называет цену, по которой продан предмет аукциона, и объявляет о продаже данного предмета аукциона, а также сообщает номер участника аукциона, выигравшего аукцион по данному предмету аукциона (далее – победитель аукциона).

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством, составляет 1 500,00 рублей.

Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участником документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись.

Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Телефоны для справок: (+37517) 209-90-93, 209-92-78.

■ Гарачая лінія

Ці выносіць сваркі з хаты?

За 4 гады работы спецыялісты «гарачай лініі» для пацярпелых ад дамашняга гвалту (8-801-100-8-801) адказалі амаль на 8,5 тысячы званкоў. Сярод абанентаў — жанчыны і мужчыны з розных рэгіёнаў краіны, рознага ўзросту і сацыяльнага статусу. Наколькі запатрабавана работа «гарачай лініі» ў сучасным грамадстве? Хто сядзіць па той бок тэлефоннай трубкі? Як змагацца з дамашнім насіллем? На гэтыя пытанні адказала кіраўніца агульнанацыянальнай «гарачай лініі» для пацярпелых ад дамашняга гвалту грамадскага аб'яднання «Гендарныя перспектывы» Ганна КОРШУН.

— Існуе меркаванне, што дамашняе насілле найчасцей узнікае ў непаспяховых сем'ях. Праўда гэта ці стэрэатып?

— Адназначна стэрэатып. Дамашняе насілле — праблема латэнтная, вельмі схаваная. Канешне, калі сям'я асацыяльная і знаходзіцца на ўліку ва ўчастковага, то факт гвалту ў такіх сем'ях больш прыкметны. У забяспечанай сям'і, дзе агрэсар займае важны пост у грамадстве, жанчыны вельмі напалоханыя. Агрэсары ўсялякімі метадамі імкнуцца ўздзейнічаць на ахвяру і супрацьстаяць звароту ў органы ўлады. Статыстыка нашай «гарачай лініі» гаворыць пра тое, што 58% агрэсараў маюць алкагольную залежнасць, але ў 79% выпадкаў гвалт адбываецца незалежна ад іх стану. У 25% выпадкаў насілле здзяйсняюць беспрацоўныя, каля 22% — людзі з рабочай прафесіяй, 11% агрэсараў — спецыялісты сярэдняга звяна, 7% — кіраўнікі, службовыя асобы і прадпрымальнікі. Нярэдка жанчыны прызнаюцца, што муж-агрэсар з'яўляецца былым ці дзеючым супрацоўнікам міліцыі або дзяржаўным служачым.

— Ці тэлефануюць на лінію мужчыны?

— У 94% выпадкаў па дапамогу звяртаюцца жанчыны. Астатнія 6% застаюцца за прадстаўнікамі дужага полу. Сярод іх, у асноўным, тэлефануюць пажылыя людзі, якія пакутуюць ад жорсткага абыходжання з боку дзяцей. У рэдкіх выпадках да нас звяртаюцца самі агрэсары-мужчыны, найчасцей гэта мужы або сыны. За ўвесь час работы лініі такіх зваротаў было ўсяго 10. Падчас званкоў гучалі або пагрозы ў адрас спецыялістаў, або апраўданні ў свой бок тыпу «мая жонка сама ва ўсім вінаватая». Некалькі разоў агрэсары ўсё ж прызнавалі ўспышкі гневу са свайго боку і прасілі дапамагчы справіцца з імі.

— Якія цяжкасці ўзнікаюць у супрацоўнікаў лініі падчас работы з ахвярамі гвалту па тэлефоне?

— На лініі працуюць чатыры кансультанты-псіхолагі і адзін юрыст. Наш прынцып: прапанаваць максімальна магчымую кваліфікаваную кансультацыйную (інфармацыйную, сацыяльную, юрыдычную і псіхалагічную) дапамогу па тэлефоне. Праблема ў тым, што мы не маем зваротнай сувязі з ахвярай. Гэта значыць, што спецыяліст не можа адсачыць, да якіх з прапанаваных рэкамендацый прыслухалася дзяўчына, які алгарытм вырашэння праблемы абрала. Канешне, работа ў сістэме «чалавек-чалавек», тым больш у такой далікатнай тэме, пакідае адбітак на эмацыянальным стане спецыялістаў. Яны працуюць з супервізарамі, якія дапамагаюць справіцца з прафесійным выгараннем. Праводзім таксама групавыя трэнінгі і семінары, на якіх сумесна абмяркоўваем найбольш цяжкія выпадкі або атрымліваем дадатковую інфармацыю па праблеме. Цяжкасці ўзнікаюць з фінансавымі выдаткамі на лінію. Гэта і тэхнічнае абслугоўванне нумара, і аплата працы спецыялістаў, і размяшчэнне сацыяльнай рэкламы.

— Што мы можам зрабіць для таго, каб сумеснымі намаганнямі пераадолець праблему хатняга гвалту ў грамадстве?

— Перш-наперш трэба мяняць стаўленне грамадства да гэтай праблемы. Патрэбны закон па супрацьдзеянні хатняму гвалту. Як паказвае практыка, часцяком пацярпелыя не ведаюць пра існаванне ахоўнага прадпісання, паводле якога агрэсара могуць адсяліць на 30 сутак з сумеснага з ахвярай жылля. Аднак і тут ёсць супярэчнасці. Каб норма пачала дзейнічаць, агрэсар павінен быць двойчы прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці на працягу года. Акрамя гэтага, ахвяра павінна сабраць доказы, якія пацвердзяць факт насілля. Калі з'явіцца асобны закон, жанчыне не давядзецца збіраць доказную базу. Яшчэ кожны паасобку павінен перастаць кіравацца стэрэатыпамі тыпу «Не вынось смецце з хаты», «Б'е — значыць кахае». Нават сёння ў многіх беларускіх сем'ях жорсткае стаўленне да сужэнцаў ці дзяцей з'яўляецца нормай. У цэлым, варта працаваць над павышэннем культуры ўсяго грамадства. А пачаць можна з самага простага — патэлефанаваць на нашу лінію і даведацца больш падрабязна пра алгарытм дзеянняў у сітуацыі гвалту.

Пра што расказвае «гарачая лінія»:

* * *

Жанчына неаднаразова трывала псіхалагічны гвалт

ад мужа, а потым здарыўся выпадак фізічнага насілля. Яна адразу звярнулася на «гарачую лінію». Мужчына ў гэтай сітуацыі вельмі даражыў адносінамі, таму ён пачаў працаваць з псіхолагам. Сужэнцы паасобку наведвалі спецыялістаў. Праз некаторы час жанчына ператэлефанавала і сказала, што ўсё наладзілася, цяпер яны чакаюць дзіця. Ужо не звязвалася са спецыялістамі чатыры гады...

* * *

Маладая жанчына судзілася з мужам за дваіх дзяцей. Яна па спецыяльнасці дызайнер. У перыяд непрыемных разбіранняў пачала маляваць, а пазней зладзіла сапраўдную выстаўку карцін. Пачала сябе рэалізоўваць, наладзіла новыя адносіны. У выніку яна прызналася: «Я не верыла, што калі-небудзь зноў здолею быць шчаслівай, але гэта магчыма!»

* * *

Жанчына-пенсіянерка жыла з дарослым сынам у адным доме. Яе муж памёр рана, а маці імкнулася як мага лепш забяспечыць сваіх дзяцей. Прайшлі гады, малодшы сын страціў з матуляй усе сувязі, а старэйшы пачаў прымяняць фізічны гвалт. Яго нервавала прысутнасць маці ў доме. Жанчына днём гатавала ежу, а нанач сыходзіла на вакзал або ў лес. У міліцыю звярнулася толькі тады, калі зразумела, што сын можа яе забіць. У выніку — жанчына звярнулася ў суд, які задаволіў яе іск на ўласнае ўтрыманне, і пачала жыць асобна ад сына.

* * *

Беларуска пазнаёмілася з грэкам, завязаўся раман, яна паехала за мужчынам у Грэцыю і нарадзіла хлопчыка. Але муж стварыў невыносныя ўмовы для жыцця жонкі: пастаянна прыдзіраўся, прыніжаў і зневажаў. Яна адчувала сябе як у турме. У выніку — жанчына ўцякла з краіны. Потым пачаліся клятвы ў каханні і маленні вярнуцца. Яна зацяжарала другім дзіцем, але сітуацыя толькі пагоршылася. Жанчына зноў падманным шляхам з'ехала. Калі ўсё пачало паўтарацца зноў, кабета дала апошні шанц — сям'я зняла кватэру ў Беларусі. У ахвяры хапіла трывання на чатыры дні...

* * *

Ужо каторы год беларуска не можа з'ехаць ад гвалтаўніка з Лівана. Яна жыве там нелегальна па турыстычнай візе, якая даўно скончылася. Пасведчання на права жыхарства муж, зразумела, не дае. Акрамя гэтага, жанчына нарадзіла дзіця. Каб аформіць малому беларускі пашпарт, трэба звярнуцца ў пасольства, а пакуль МЗС нашай краіны не мае права ўмешвацца ў справы іншай дзяржавы.

Агульнанацыянальная «гарачая лінія» для пацярпелых ад дамашняга гвалту: 8 801 100-88-01 (штодзённа з 08.00 да 20.00). Званкі ананімныя, прыватныя і бясплатныя са стацыянарных тэлефонаў. Званок з мабільнага аплачваецца па тарыфах злучэння са стацыянарнай сеткай.

Агульнанацыянальная дзіцячая гарачая лінія: 8 801 100-16-11.

Вераніка УЛАСЕВІЧ.
veronika.ulasevich@mail.ru

■ Дадому

ТАТЫ І МАМЫ ДЛЯ ЎСІХ

З пачатку года беларускія сем'і ўсынавілі 425 сірот

У нашых пар стабільна высокая цікавасць да ўсынаўлення, адзначае дырэктар Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Наталля ПАСПЕЛАВА. У год прыкладна 600 хлопчыкаў і дзяўчынак з ліку сірот і малых, што засталіся без апекі бацькоў, перадаюцца ў сем'і.

Да італьянскіх прыёмных бацькоў за дзевяць месяцаў бягучага года паехалі 19 дзяцей. Да канца года чакаецца, што гэта лічба будзе ў два разы большая: цяпер разглядаюцца адпаведныя дакументы. Што цікава, італьянскія прыёмныя сем'і адрозніваюцца ад беларускіх. Там на ўсынаўленне рашаюцца збольшасці бяздзетныя пары — такіх 90 працэнтаў. І яны гатовы прымаць і падлеткаў, а не толькі малых. У нас сітуацыя іншая. 60 працэнтаў беларускіх сем'яў, якія ўсынаўляюць дзяцей, маюць сваіх дачок і сыноў.

Тры гады працуе інфармацыйны партал dadomu.by — вялікая электронная база дзяцей, якія маюць патрэбу ў новых татах і мамах. На рэсурсе змешчаны дадзеныя аб чатырох тысячах хлопцаў і дзяўчатак. Штодзень сайт наведвае каля 200—300 карыстальнікаў. «Гэта гаворыць пра тое, што мы ідзем у правільным кірунку. Вывелі гэту тэму з ліку забароненых і непрыемных», — упэўнена Наталля Паспелава.

Партал за час сваёй працы дапамог знайсці сем'і для 1327 дзяцей. З іх 505 былі ўсыноўлены, 242 — перададзены ў апякунскія сем'і, 213 — у прыёмныя сем'і, 150 — у дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. Яшчэ 217 хлопцаў і дзяўчат вярнуліся да родных бацькоў. Дырэктар цэнтра ўсынаўлення прызнаецца, што яны недаацанілі рэсурсы сайта і нават не разлічвалі на такі эфект:

— Мамы, калі ўбачылі, што інфармацыя пра іх дзіця выстаўлена ў сеціве, задумаліся над тым, каб аднавіцца ў бацькоўскіх правах. Я лічу, гэта самае вялікае дасягненне партала.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

■ Сацыяльны клопат

ПЛЮС 35 РУБЛЁЎ У МЕСЯЦ

Дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда збіраюцца павысіць

Мінпрацы і сацабароны хоча ўзмацніць меры падтрымкі сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей з асаблівасцямі ў развіцці. Шэраг прапаноў утрымлівае праект новай рэдакцыі закона «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, што выхоўваюць дзяцей», які ўжо падрыхтаваны і ўнесены ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

У прыватнасці, бацькам дзяцей з інваліднасцю дадуць права працаваць на ўмовах няпоўнай занятасці (не больш, чым на палову стаўкі) ці дома і пры гэтым атрымліваць дапамогу па доглядзе. Таксама плануецца павысіць памер выплат па доглядзе малых з трэцяй і чацвёртай ступенню страты здароўя — са 100 да 120 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму. Акрамя таго, бацькі такіх малых змогуць разлічваць на дапамогу па доглядзе незалежна ад віду пенсіі, якую атрымліваюць (пакуль такое права ёсць толькі ў татаў і мам з інваліднасцю).

У цэлым у нашай краіне дзейнічае эфектыўная сістэма падтрымкі сем'яў з дзецьмі, лічыць **намеснік начальніка аддзела народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі ведамства Марына АРЦЁМЕНКА.** Дзяржаўнымі дапамогамі ахоплена амаль кожнае трэцяе дзіця — 557 тысяч чалавек. Летась выдаткі на гэтыя выплаты склалі 17 трыльёнаў недэнамінаваных рублёў, ці два працэнты ад ВУП.

Уводзяцца і новыя віды дапамог. З мінулага года, напрыклад, сем'і, якія адначасова выхоўваюць малога да трох гадоў і дзіця ва ўзросце ад трох да 18 гадоў, атрымліваюць выплаты ў памеры паловы бюджэту пражыткавага мінімуму. Такую дапамогу даюць 167 тысячам чалавек.

Працягваецца праграма «Сямейны капітал». На 1 кастрычніка 2016 года ў Беларусбанку адкрыта амаль 26 тысяч дэпазітных рахункаў на агульную суму больш за 257 мільёнаў долараў. У тым ліку сёлета адкрыта 14 тысяч рахункаў на суму ў 141 мільён долараў.

— Летась пашыраны ахоп сем'яў паслугамі па доглядзе дзяцей. Права на паслугі нянькі дадаткова дадзена бацькам, якія выхоўваюць малых з інваліднасцю ва ўзросце да 18 гадоў. Раней атрымаць сацыяльную няньку маглі толькі сем'і з двайнятамі і дзецьмі-інвалідамі да чатырох гадоў. Акрамя таго, павялічана колькасць норма-гадзін у тыдзень для бацькоў з двайнятамі — з 12 да 20 гадзін, — падкрэслівае Марына Арцёменка.

Навацыі ў сямейнай палітыцы прадугледжвае і праграма «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь» на 2016—2020 гады. Сярод іх — развіццё сістэмы антыкрызіснай псіхалагічнай дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзіця з асаблівасцямі ў развіцці, аказанне падтрымкі падлеткам, што перажылі крызісныя сітуацыі.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Кінакрокі

ШТО НАМ ПАКІНУЎ АНДЖЭЙ ВАЙДА?

Той, хто на экране адлюстроўвае эпоху, сам становіцца эпохай

Больш за сорак фільмаў, створаных за шэсцьдзясят гадоў працы. Смерць знакамітага польскага рэжысёра — гэта сыход тытана. Яго карціны трымаюць сусветны кінематограф, як тыя дванаццаць багоў — неба на сваіх плячах. Сапраўдны класік кіно — творца, мэтр, бог. Усяму свету ён шчыра, прыгожа, метафарычна расказваў пра Польшчу — пра часы вайны, пра Варшаўскае паўстанне супраць гітлераўскіх акупантаў у 1944 годзе, пра антыкамуністычнае Супраціўленне, жыццё рабочага класа, пра расслаенне грамадства напрыканцы стагоддзя. 9 кастрычніка рэжысёр пайшоў з жыцця ва ўзросце дзевяноста гадоў, на наступным тыдні — 19 кастрычніка — у Кракаве адбудзецца пахаванне. Класік сышоў — класіка засталася.

«Польшча была яго страсцю», — сказаў рэжысёр і кіраўнік Саюза польскіх кінематаграфістаў Яцэк Бромскі польскаму тэлебачанню. Заставалася страсцю, калі была залежнай, калі стала самастойнай, калі яе дзялілі, калі яе акупавалі, калі польская нацыянальная самасвядомасць цярпела прыніжэнне і калі ўздымала галаву. Радзіма прысутнічае ў кожным фільме Вайды — як у карцінах кшталту «Катыні», якую зняць аказалася магчымым толькі пасля 1989 года, так і ў экранізацыях рускай прозы — «Сібірская лэдзі Макбет» паводле Мікалая Ляскова, «Бесы» паводле Фёдара Дастаеўскага, «Пілат і іншыя» паводле Міхаіла Булгакава. Фільмы Анджэя Вайды адзначаны ўзнагародамі Канскага, Венецыянскага, Берлінскага кінафестываляў, адзнакамі Брытанскай кінаакадэміі, Сезарам, чатыры разы творы рэжысёра намінаваліся на Оскар у катэгорыі «Найлепшы фільм на замежнай мове». Апошнюю карціну Вайды «Паслявобразы» польская оскараўская камісія таксама прадставіла на суісканне прэміі.

Ён нарадзіўся ў сям'і настаўніцы і ваеннага, што, вядома ж, значыла пераезды, уражанні ад воінскіх рытуалаў... У 1939 годзе бацьку забралі ў палон і расстралялі ў Катыні.

А пачалося ўсё ў 1954 годзе з фільма «Пакаленне» — першай поўнаметражнай карціны Анджэя Вайды (у якой, дарэчы, зняліся Раман Паланскі і Збігнеў Цыбульскі). Хоць дакладней, канешне ж, усё пачалося з цяжкага, гаротнага, крывавага досведу, які працінае ўсю фільмаграфію рэжысёра. Ён нарадзіўся ў сям'і настаўніцы і ваеннага, што, вядома ж, значыла пераезды, уражанні ад воінскіх рытуалаў і датычнасць да Арміі Краёвай, якой пазней — падчас вайны — Вайда прынясе прысягу. У 1939 годзе бацьку забралі ў палон і расстралялі ў Катыні. «Ён пайшоў на вайну і не вярнуўся. Маці больш не магла заставацца дома і павінна была працаваць, мы сталі работнікамі. З інтэлігентнай сям'і апынуліся ў зусім іншым асяроддзі». Яму было 13 гадоў, калі пачалася вайна, хутка ўжо не было магчымасці вучыцца, заставалася толькі працаваць. «Гэта дапамагло мне зразумець, што значыць фізічная праца, што значыць працаваць кожны дзень, пачынаючы з ранку, і калі ў 50-я гады казалі пра рабочы клас, я адказваў сабе, што «таксама быў чорнарабочым». Тут для мяне не было нічога незразумелага».

Кадр з фільма «Попел і дыямент».

Падумаць толькі, але Анджэй Вайда апроч іншага дапамагаў рэстаўраваць храмы — гэта рабілася ў ваенны час! Ужо ў 1946 годзе будучы рэжысёр паступіў у Акадэмію мастацтваў у Кракаве. Напэўна, адсюль у яго фільмах з'явіліся вобразы творчай інтэлігенцыі ва ўмовах вайны. «Яны, нашы прафесары, адважыліся пісаць падчас вайны эцюды, пейзажы і нацюрморты. І гэта было нейкае супраціўленне... гэтай вайне, усяму таму, што несла нацысцкая акупацыя ў Польшчы». Ужо ў карціне «Канал» сярод групы байцоў Арміі Краёвай, што адступае па каналізацыйных каналах падчас паўстання 1944 года ў Варшаве, быў музыкант. У разбураным доме ён іграў на разладжаным піяніна і глядзеў у пустэчу затуманенымі вачыма. Дарэчы, менавіта фільм «Канал» заявіў пра польскага рэжысёра Анджэя Вайду ўсяму свету.

Але гэта было пасля таго, як той вырашыў, што кінамастацтва больш адпавядае патрабаванням і стылю пасляваеннага часу і, не скончыўшы Акадэміі мастацтваў, пайшоў вучыцца ў вышэйшую кінашколу ў Лодзі. «Прафесар Ежы Цяпліца — наш рэктар — прывёз з Парыжа калекцыю авангардных французскіх фільмаў, не савецкага авангарда, не Эйзенштэйна, а менавіта французскага. Я паглядзеў «Механічны балет», «Андалузскага сабаку», «Залаты век», і зноў «Механічны балет». Усе гэтыя фільмы адкрылі мне вочы на зусім іншае кіно. У нас такое кіно не толькі ніколі не ствараласа, мы такога нават не бачылі».

«Гэта дапамагло мне зразумець, што значыць фізічная праца, што значыць працаваць кожны дзень, пачынаючы з ранку, і калі ў 50-я гады казалі пра рабочы клас, я адказваў сабе, што «таксама быў чорнарабочым».

Пайшоў туды, адшукаў. Бачу — і напраўду чорны ён: у цёмным куце, каля бакаў са смеццем, дзверы невялічкія, надпісаў ніякіх...

Але ж адчыніў іх, зайшоў. І зноўку разгубіўся: чарга там — з «белых людзей». Тэатр абсурду: гандлёвая зала амаль пустая, а тут...

Дастаяўся я, купіў той пяшчотнай, ружовенькай, свежанькай каўбаскі — зрабіў дома свята і тым самым сярод сямейнікаў падвысіў свой аўтарытэт.

А калі наогул... Працаваць на мясакамбінаце было некалі ці не гэтак жа прэстыжна, як у Зорным гарадку. Не толькі з-за мясных «пайкоў», найбольш — з-за шырокіх магчымасцяў, бо адтуль вельмі шмат чаго і вывозілі, і выносілі.

Расказвалі, напрыклад, што там паміж агароджай і цэхам каўбас бегаў злы сабака, якога ахова спецыяльна не карміла, каб больш лютаваў, адбіваючы ў людзей усякае жаданне хоць нешта «скамуніздзіць».

Рабочыя тады што прыдумалі: кавалачак смачнай каўбаскі туга абмотвалі моцным шпагатам, надзейна хавалі канцы і кідалі. Чатырохногі ахоўнік — голад не цётка — хапаў той «падарунак» і носам чуў, што можна з'есці, але ж пакуль зубамі ды лапамі «вылузваў» яго з «абгорткі», праходзіў час, за які «вынаходнікі» больш-менш спакойна перапраўлялі дэфіцыт за агароджу.

А былі ж яшчэ і вынаходніцы. Яны, як расказвалі, кавалкі выразкі прано сілі ў ліфчыках (і паспрабуй хто памацаць!..), прыкладвалі да жыватоў.

Цікава жылі... Успомніць сорамна.

Дарэчы, сярод прэстыжных прадпрыемстваў быў тады і наш «Інтэграл». Мясам там, вядома ж, не пахла, затое выпіўкай...

Многім для работы выдавалі спірт. Вось людзі яго і эканомілі, потым зліваліў дробную тару, а перад самай прахадной — выпівалі. І ўсё ў парадку было: ніхто нічога не выносіў, з работы ўсе цвярозыя ішлі, а калі п'янелі, дык гэта ж на хаду, ужо за межамі прадпрыемства, на вуліцы...

Іван Гаральчук,
г. Мінск.

БАЯВАЯ МАШЫНА... САЎГАСА

У дзевяностыя гады мінулага стагоддзя спісаныя аўтамабілі не ставілі пад плот, не разбіралі, не рэзалі на металалом, а перадавалі іншым — на прадпрыемствы, у гаспадаркі.

Вось і ў наш тады яшчэ саўгас з адной вайсковай часці паступіў бартавы ЗІЛ-131. За руль яго (машыну празвалі чамусьці «бэмсам») старшыня пасадзіў маладога жыўчыка і потым не раз пашкадаваў.

Неяк, напрыклад, загрузілі ў кузаў насенне лёну, даручылі завезці яго ва ўрочышча Каралі, што на беразе возера Якаўскае. Кіроўца адным махам дабраўся туды, а разгрузіцца не можа, бо трактарыст і сеяльшчык далёка ў полі: іх трэба пачакаць.

Трэба дык трэба. Вадзіцель пакінуў свой «бэмс» на дарозе, а сам трохі адышоў. Толькі схаваўся — прысеў у кустах, як бачыць... «паўзе» яго машына ў бок возера. Хлопцу б пабегчы, спыніць яе, — порткі злавіць не можа.

Добра, што ў тога «бэмса» хуткасць была невялікая: у вадзе апынулася толькі задняя частка кузава, а насенне ў мяхах стаяла сперади...

Не паспела забыцца гэта прыгода, як з «бэмсам» адбылася новая. У саўгас на нарыхтоўку кармоў прыехалі «шэфы» з Наваполацка і адразу ж раздзяліліся: жанчыны ўзяліся зграбаць сена ў кучы, мужчыны — віламі грузіць яго на машыну, а заадно — пыхкаць цыгарэтамі. Кіроўца паспрабаваў быў нешта сказаць пра бяспеку, тыя хіба пасмяяліся: маўляў, што згарыць, тое не згніе, нічога з сенам не зробіцца...

Яны так меркавалі, а Бог у гэты час слухаў ды пасмейваўся: пагрузка ўжо амаль завяршылася, калі з кузава стаў прабівацца ледзь прыкметны дымок. Шэфы пазіраюць на яго ды разгублена маўчаць, а ў кіроўцы мазгі ледзь не плавяцца ад думкі, што рабіць? Разгружаць машыну? Але ж наладавана там пад самую завязку! Пакуль раскідаеш... Ды і хто за гэта возьмецца? Небяспечна... Значыць, выйсце адно: трэба гнаць да майстэрні. Там помпа ёсць для мыцця машын.

Карацей, «бэмс» з усёй сваёй моцы памчаў па дарозе. І чым далей, тым больш нагадваў падбіты самалёт, бо ззаду за машынай шлейфам цягнуўся дым, а збоку ва ўсю бушавала полымя.

Пашчасціла: да майстэрні хлопец неяк даехаў, агонь патушылі. Тое сена, што ўдалося ўратаваць, пагрузчыкам скінулі на зямлю. Яно нейкі час патлела, потым — яшчэ раз пасохла. Шэфам за працу плаціць не сталі.

Трэцяя прыгода з машынай адбылася, калі кіроўца па дарозе з камандзіроўкі... заснуў за рулём, а «бэмс» тым часам «пацягнула» ў хмызняк: ён пакатаўся там, наламаўшы дроў, потым «носам», мякка кажучы, забурыўся ў насып узбочыны.

Казалі, што потым, убачыўшы гэта, дырэктар саўгаса як не пасівеў: крычаў хлапцу, што звольніць, што перадасць машыну іншаму... Але ж потым неяк пацішэў. І яны, баявая машына саўгаса і яе нязменны кіроўца, прайшоўшы ваду і агонь, сталі несці службу далей.

Аляксандр Матошка,
в. Янкавічы, Расонскі раён.

«ЦЕСНАЯ» ПАРТЫЯ

Пра вайну мая радня гаварыць не любіла. Можа, таму, што хапіла ёй больш, як іншым: жыла ў Заходняй Беларусі, адпаведна — першай трапіла пад акупацыю, апошняй — пад вызваленне. Аднак іншы раз нешта прарывалася — не сказаць, каб смешнае, але ж... Цётка Клаўдзя, помню, расказвала:

— Ай, дзетачкі, як толькі вайна пачалася, немцы адразу ж пайшлі. Бяжым мы з вёскі ў лес, каб схавацца, а самалёт з крыжамі за намі. І з кулямёта як застрачыць... Бабы падаюць, у разорах хаваюцца, а я не магу, бо цяжарная ж сваім Васільком, апошнія тыдні яго даношвала. Жывот вялізазны — бегчы не дае, дык я яго рукамі абхапіла і нясу... А што пад нагамі — зусім не бачу. За нейкі корч зачапілася, ды як ляпнуся! Ну, думаю, усё — забіла дзіця. Прыслухалася, — аж не, штурхаецца, кажа: «Уставай, мамка! І сама ратуйся, і мяне ратуй».

Вось яны і ўратаваліся: хлопчык здаровым радзіўся, усе ваенныя нягоды перанёс. А мужа цёткі Клаўдзі, старшыню мясцовага калгаса, немцы расстралялі.

...У дзеда Івана, інваліда з той, яшчэ першай, вайны з немчурой, быў свой успамін:

— Нашы тады адступалі — страх глядзець было: хто паранены, хто раздзеты... Афіцэр адзін немаўлятка нёс. Не ведаю, як доўга. Але ж тут, у вёсцы, у двор да адных заляцеў і кажа: «Вазьміце дзіцятка. Мне карміць няма чым, а жонку ў час бамбёжкі забіла. Застануся жывым — знайду вас, забяру дачушку»... Грошай гаспадарам даў, гадзіннік свой з рукі зняў, чамадан паўнюткі пакінуў і пабег даганяць сваіх. Тут жа ўслед за імі немцы пайшлі. А ноччу ціха стала — нікога як быццам няма. Суседка наша Марыля выйшла з хаты карову даіць, чуе, на дарозе быццам кацянятка пішчыць. Падышла, глянула, а гэта дзіця. Тыя нелюдзі афіцэрскае дабро прысабечылі, а дзяўчынку на дарогу вынеслі і пакінулі. Забрала Марыля малечу, прынесла дадому. Муж паглядзеў на яе ды кажа: «Мы ж не звяры якія... Хай гадуецца з нашым Сярожам. Сястрой яму будзе». Так яно і сталася, бо па сваё дзіця бацька гэтай дзяўчынкі так і не вярнуўся, відаць, не выжыў, злажыў галаву на ваенных дарогах.

А вось дзядзька Змітрок (начытаны дужа быў, культурны!) любіў расказаць, як ён ад «кар'еры адмовіўся». Гучала гэта прыкладна так:

— Пасля вызвалення мяне з адным таварышам выклікаюць у райкам да самага высокага начальства і кажуць: пішыце, маўляў, заявы: прымем вас абодвух у партыю. І нават больш за тое — за асобыя заслугі ў барацьбе з фашыстамі — адкрыем усе дарогі наверх: адразу ж накіруем у Мінск, у вышэйшую партыйную школу... Мы, вядома, не супраць. Я вучыцца хацеў. Але ж гэты начальнік праз паўзу дадае, што апроч нас у тую школу паедзе яшчэ адзін чалавек, Самусік, бо ён таксама заслужаны... Пераглянуліся мы з сябруком: маўляў, ведаем, які ён заслужаны. Людзі ў сцірце саломы параненых танкістаў хавалі, а ён іх немцам здаў... І каб мы пасля гэтага з ім вучыцца паехалі!.. Не, кажам, дзякуй, але ў адной партыі з Самусікам нам месца няма.

...Адна была вайна, адна велізарная бяда — агулам, на ўсіх.

І свая. На кожнага.

Наталля Каліноўская,
г. Віцебск.

Рубрыку вядзе
Валянціна ДОЎНАР.
dounar@zviazda.by

■ Зачапіла

А. ПУКШАНСКІ. «БАБУЛЯ З ВІШНІ»

(«Звязда» ад 12 кастрычніка)

— Такія бабулі і ёсць, як кажуць, «соль зямлі». І сваёй любоўю да малой Радзімы яны мне вельмі падабаюцца. Адразу ўспомніла свае дзіцячыя гады, калі ездзіла ў вёску на летнія канікулы да бабулі. Гэта зусім іншы «свет». Вяскоўцы і тады былі больш шчырымі і гасціннымі, чым большасць маіх знаёмых гараджан. Не гаворачы пра сённяшні дзень. Такія бабулі сагрэюць цеплынёй сваёй душы, дадуць карысную параду, як выйсці з цяжкай жыццёвай сітуацыі. Могуць навучыць пячы хлеб, шыць...

На жаль, усё больш становіцца вёсак, дзе жывуць некалькі чалавек ці наогул няма насельніцтва. Вось не будзе гэтай бабулі (дай божа ёй 100 гадоў і больш), і яшчэ адной «кропкі» не стане на карце...

А па сутнасці, калі задумацца, вёска каля балота, якое з'яўляецца часцінкай «лёгкіх Еўропы», магла б стаць цэнтрам для экалагічнага турызму, фальклорных вандровак... Упэўнена, што ў старым доме продкаў бабулі пажадалі б спыніцца на некалькі дзён і нашы, і іншаземныя турысты.

Было б цікава прачытаць аб прыкладах, калі прадпрымальнікі адраджаюць вёскі, якія знікаюць. Чаму яны гэта робяць, няўжо толькі дзеля прыбытку? Наколькі насамрэч мясцовая ўлада зацікаўлена ў падтрымцы такіх праектаў? Або... менш вёсак, менш галаўнога болю? Упэўнена, такія пытанні хвалююць не толькі мяне.

Вольга Зубец, *Мінск.*

С. КУРКАЧ. «СУХІ ПОРТ ШАЎКОВАГА ШЛЯХУ»

(«Звязда» ад 12 кастрычніка)

— Ідэя стварыць партовую свабодную эканамічную зону пад Мінскам сапраўды цудоўная. Побач аэрапорт і добрая транспартная лагістыка Калядзічаў. Усё гэта паспрыяе прыцягненню ў Беларусь сапраўды знакавых інвестараў з-за мяжы. Як бачым, індустрыяльны парк «Вялікі камень» сёння будуецца даволі аператыўна. Атрымліваецца, што могуць нашы чыноўнікі і іншыя службы варушыцца і хуценька рыхтаваць адпаведныя дазволы для асваення тэрыторыі. Бо перспектыва супрацоўнічаць «у першых шэрагах» з такой вялікай дзяржавай, як Кітай, дарагога каштуе.

Гэта, калі пра плюсы, але існуюць і апасенні... Тут галоўнае, каб заяўлены парк быў сапраўды высокатэхналагічным цэнтрам супрацоўніцтва з гэтай краінай, а не стаў звычайнай вялікай перавалачнай базай кітайскіх тавараў у краіны ЕС і на тэрыторыю Расіі. А яшчэ некалькі слоў пра турызм. Прыкладна 220 га парка на беразе возера плануецца выкарыстоўваць для забаў і турызму, дзе будзе, у тым ліку, створаны і нейкі кліматычны анклаў з трапічнымі ўмовамі і раслінамі. Я б параіў нашым эколагам да гэтага праекта больш пільна прыгледзецца, бо выпускаць «на волю» чужародныя расліны на нашай тэрыторыі неяк боязна.

Уладзіслаў, *Маладзечна.*

В. ПУСТАВІТ. «Я НЕ БАЮСЯ СКАЗАЦЬ «ПРАБАЧ»

(«Звязда» ад 13 кастрычніка)

— Шчыра захапляюся такімі людзьмі, як Ганна. І як яна ўсё паспявае? Не магу зразумець... Адзінае, не пагаджуся наконт таго, што дзецям варта праходзіць школьную праграму дома. Ніхто не адмяняў сацыялізацыю, якая найлепшым чынам адбываецца ў школьным класе з равеснікамі. Няхай не ўсе з іх ідэальныя ці добра выхаваныя, але ж і ў жыцці так: нам не заўжды трапляюцца добрыя і блізкія па духу людзі... Атрымліваецца, што дзеці растуць у цяплічных умовах, не сутыкаюцца непасрэдна з грамадствам і тыповымі для яго праблемамі. Гурткі ў разлік не бяру, бо там яны праводзяць не так шмат часу. Але ў любым выпадку зычу ўсёй вялікай сям'і Харланчукоў-Южаковых поспехаў і дабрабыту!

Ірына, *Мазыр.*

С. БАРЫСЕНКА. «ЯНЫ ЖЫВУЦЬ СЯРОД НАС...»

(«Звязда» ад 13 кастрычніка)

— Я вось згодна з кожным спецыялістам, якім вы далі слова... Між тым у інтэрнэце трапіла на вочы іншая публікацыя, у якой мяне збянтэжыла фраза: «бацька Улада ўпэўнены, што менавіта таблеткі сталі прычынай яго зверскага ўчынку». Маўляў, для лячэння прышчоў хлопец прымаў прэпарат «Раакутан», а там сярод пабочных эфектаў — дэпрэсія, псіхоз, суіцыдальныя думкі. Словам, прэпарат вінаваты! Няўжо дарослы мужчына мог сапраўды так сказаць?! У пабочных эфектах фактычна любога лекавага прэпарату можа быць такое пазначана!.. Я добра ведаю гэты прэпарат, яго прымала мая дачка, і прымала амаль год. Дзесьці праз паўгода твар пачаў станавіцца больш чыстым, настрой дзіцяці быў выдатны! Дзяўчына перастала камплексаваць, што тут гаварыць... Так што мне нават не было шкада тых грошай, бо каштуе прэпарат нямала. Важна яшчэ тое, што прэпарат прадаецца толькі па рэцэпце і яго не выпісваюць раз і на ўвесь год — трэба рэгулярна хадзіць да ўрача, які ацэньвае прамежкавы стан, пытаецца аб тым, які наогул вы адчуваеце эфект. Не веру, што прафесіянал не змог бы западозрыць у пацыента такія неверагодныя, менавіта зверскія, зрухі ў псіхіцы!»

Людміла Сяргееўна, *Бабруйск*

■

■ Даследаванні

СУМНЫЯ ФІЛЬМЫ ПАЛЯГЧАЮЦЬ БОЛЬ

Сумесныя перажыванні дапамагаюць людзям не толькі стаць бліжэй, але і павысіць уласны болевы парог

Фільмы, якія заканчваюцца сумна ці трагічна, нязменна карыстаюцца папулярнасцю ў гледачоў, асабліва жаночага полу, — дастаткова ўспомніць легендарны «Тытанік» Джэймса Кэмерана: па касавых зборах ён стаў адным з самых паспяховых фільмаў усіх часоў. Чаму ж людзі глядзяць і перaглядаюць такія стужкі, нягледзячы на тое, што «пазітыву» ў іх не так шмат? Адна з прычын, як мяркуюць даследчыкі з Оксфарда, заключаецца ў тым, што пры праглядзе падобнага кіно ў нас спрацоўваюць нейрафізіялагічныя механізмы, якія дапамагаюць адчуць супольнасць з іншымі людзьмі і заадно душаць болевыя адчуванні.

Раней Робін Данбар і яго калегі паказалі, што сумесныя заняткі павышаюць узровень эндарфінаў у мозгу. Як вядома, эндарфіны даюць пачуццё эйфарыі (хоць у цэлым адчуванне шчасця, радасці, задавальнення, эйфарыі і г.д. залежыць не толькі ад іх), акрамя таго, яны стымулююць нейронавыя ланцужкі, якія адказваюць за сацыяльныя сувязі, а таксама дапамагаюць паменшыць болевыя адчуванні. Калі малпы вычэсваюць і чысцяць адна адной поўсць, гэта стымулюе ў іх выпрацоўку эндарфінаў, і тое ж самае адбываецца ў нас, калі мы займаемся танцамі або спяваем. З другога боку, калі ў нас пачынаюць з-за моцнай нагрузкі балець перанапружаныя мышцы, мозг спрабуе абязболіць іх з дапамогай тых жа ўнутраных марфінавых анальгетыкаў.

Некалькі месяцаў таму група Данбар апублікавала артыкул, у якім гаварылася аб тым, што чым шырэйшы ў чалавека круг зносін, чым больш у яго знаёмых і сяброў, тым вышэйшы ў яго болевы парог — відавочна, дзякуючы тым жа эндарфінам, якіх становіцца тым больш, чым больш актыўна мы маем сацыяльныя зносіны. У далейшым стала зразумела, што справа тут не столькі ў наяўнасці сяброў і не столькі ў актыўнай сумеснай дзейнасці, колькі ў сумесных перажываннях, нават калі гэтыя перажыванні не занадта «пазітыўныя».

Даследчыкі паказвалі ўдзельнікам эксперыменту фільм «Сцюарт: мінулае жыццё» — гісторыю чалавека, які з добрага і клапатлівага хлопчыка вырас у наркамана і інваліда і ў рэшце рэшт кінуўся пад цягнік. У якасці альтэрнатывы гэтай трагічнай гісторыі выступалі два дакументальныя фільмы: адзін — пра лонданскі Музей прыродазнаўства, другі — пра гісторыю старажытнай Ірландыі. Усе стужкі глядзелі кампаніямі, і гледачоў прасілі да і пасля прагляду прайсці псіхалагічны тэст на тое, як яны ставяцца да іншых людзей, з якімі яны толькі што паглядзелі адзін з фільмаў (або з якімі ім цяпер толькі трэба будзе яго паглядзець). Акрамя таго, быў яшчэ і тэст на болевую адчувальнасць: трэба было, абапёршыся спінай аб сцяну, прысесці на нагах так, каб у каленях быў прамы вугал, нібыта чалавек сядзеў на нябачным крэсле. Доўга ў такім стане пратрымацца немагчыма з-за таго, што пачынаюць балець мышцы, аднак, калі ўзровень эндарфінаў у мозгу павышаны, на «нябачным крэсле» можна прасядзець крыху даўжэй.

У артыкуле ў Royal Society Open Science аўтары пішуць, што пасля прагляду фільма «Сцюарт: мінулае жыццё» ўдзельнікі эксперыменту трывалі боль на 18% даўжэй у параўнанні з тымі, хто глядзеў пра музей і пра Ірландыю. Падобныя вынікі былі і ў псіхалагічным тэсце: пасля драматычнага кіно людзі — паводле ўласных адчуванняў — станавіліся бліжэйшымі адзін аднаму. Збольшага гэта дазваляе растлумачыць, чаму многія, выйшаўшы з кіназалы, пачынаюць абмяркоўваць толькі што ўбачаны фільм (ці спектакль) з абсалютна незнаёмымі людзьмі.

Магчыма, тут сапраўды ўся справа ў эндарфінах, хоць нельга выключаць, што свой уклад уносяць і іншыя «нейрарэчывы», напрыклад, нейрамедыятар аксітацын, які таксама ўмацоўвае сацыяльныя сувязі. З іншага боку, эфект супольнасці і яднання назіраўся не ва ўсіх: траціна тых, хто глядзеў драму пра наркамана і інваліда, пасля прагляду ставіліся да сваіх калег па эксперыменце гэтак жа, як і да яго, а адчувальнасць да болю ў іх не толькі не панізілася, але нават павысілася. Магчыма, ім проста не спадабаўся фільм

Матэрыялы падрыхтаваў Іван КУПАРВАС. *hvir@zviazda.by*

ПАДОБНЫ, АЛЕ ІНШЫ

Калі будзе створаны паўнавартасны штучны інтэлект?

У 1832 годзе калежскі асэсар Сямён Мікалаевіч Корсакаў, піянер расійскай кібернетыкі, стварыў «гамеаскоп» — класіфікуючую лагічную прыладу, якая аўтаматызавала працэс параўнання ідэй і паняццяў. З тых часоў сістэмы штучнага інтэлекту пайшлі далёка наперад. У адукацыйным цэнтры «Сірыус» адбылася лекцыя кандыдата фізіка-матэматычных навук, вучонага сакратара Курчатаўскага комплексу НБІКС-тэхналогій НДЦ «Курчатаўскі інстытут» Вячаслава Дзёміна аб мінулым, сучаснасці і будучыні такіх сістэм, вытрымкі з якой апублікаваў інтэрнэт-рэсурс «лента.ру».

МОЗГ І КАМП'ЮТАР

На сучасным этапе ўсе намаганні па стварэнні штучнага інтэлекту накіраваны на тое, каб зняць частку нагрузкі з чалавечага інтэлекту, стварыць памочніка для апрацоўкі дрэнна структураванай інфармацыі.

Самая відавочная задача — работа з вялікімі аб'ёмамі інфармацыі. Гэты кірунак так і называецца: «Вялікія даныя» (Big data). Самы яскравы прыклад — Вялікі адронны калайдар. ВАК генерыруе некалькі петабайт (1 Пб = 1 000 000 Гб) інфармацыі ў секунду. Яна паступае ў розныя інфармацыйныя цэнтры па ўсім свеце, дзе апрацоўваецца камп'ютарамі, пасля чаго перадаецца фізікам для аналізу.

Але работа з вялікімі аб'ёмамі інфармацыі выявіла слабае месца сучасных камп'ютараў. Цяпер у вылічальнай тэхніцы выкарыстоўваецца так званая архітэктура фон Нэймана: памяць і працэсар фізічна падзеленыя і маюць зносіны адзін з адным з дапамогай шыны, якая знаходзіцца паміж імі. Каб выканаць каманду, працэсар пасылае запыт у памяць, тая здабывае з пэўнай ячэйкі даныя, адпраўляе іх у працэсар, затым з памяці запытваецца каманда для выканання і зноў загружаецца ў працэсар, і гэтак далей. Пастаянна ідзе перадача даных у абодвух напрамках, і вузкая гарлавіна шыны абмяжоўвае прадукцыйнасць агульнага працэсу вылічэнняў. Вядома, сёння гэтую праблему збольшага здымаюць шмат'ядзерныя працэсары, калі інфармацыя дзеліцца паміж рознымі ядрамі, апрацоўваецца ў іх адначасова, а потым вынікі зліваюцца ў нейкім адным ядры.

Чалавечы мозг уладкаваны інакш: яго архітэктура прынцыпова паралельная, а не паслядоўная. Памяць і вылічэнні ў мозгу рэалізуюцца ў адных і тых жа структурах — у нейронах. Кожная нервовая клетка падобная на маленечкі працэсар, які выконвае найпрасцейшую функцыю. Сукупнасць жа вялікай колькасці такіх элементарных працэсараў здольная рабіць даволі складаную апрацоўку невыразна структураванай інфармацыі. Калі такую схему атрымаецца ўвасобіць і ў камп'ютарах, скапіраваўшы прынцып дзеяння работы нейронаў, гэта стане прарывам.

У кожнай нервовай клеткі ёсць атожылкі — аксоны, па якіх перадаецца інфармацыя, і дэндрыты, якія прымаюць інфармацыю. Злучэнне аксона і дэндрыта называецца сінапс. Калі адбываецца генерацыя «спайка», гэта значыць уласнага электрахімічнага ўзбуджэння клеткі, з дапамогай нейрамедыятараў ток ідзе ад аднаго нейрона да іншага. Сінапс пры гэтым пластычны, ён можа мяняць эфектыўнасць перадачы сігналу. Лічыцца, што памяць фарміруецца за кошт пластычнасці сінапсаў: нейкі набор сінаптычных праніканняў вызначае нейкі пэўны ўспамін, які прайграецца пры распаўсюджванні сігналу праз гэты набор сінапсаў. Калі навукоўцы змогуць стварыць сістэму штучнага інтэлекту, у якой апаратна будзе выкарыстоўвацца той жа прынцып, гэта значыць апрацоўка і захоўванне інфармацыі ў адных і тых жа функцыянальных элементах (штучных нейронах-працэсарах з пластычнымі злучэннямі паміж імі), гэта выведзе тэхналогіі на новы ўзровень.

РАСПАЗНАВАННЕ І АСЭНСАВАННЕ

Ужо цяпер камп'ютарныя сістэмы нядрэнна спраўляюцца з распазнаннем вобразаў і гукаў. Але штучны інтэлект па-ранейшаму не асэнсоўвае звесткі, любы малюнак так і застаецца для яго наборам незразумелых рысак. Тым не менш камп'ютар можа і нумары аўтамабіляў, якія перавышаюць хуткасць, разабраць, і гаворку ў друкаваны тэкст ператварыць, і ўпадабаную песню пазнаць.

Не асэнсоўвае машына і тое, што адбываецца на біржах, але, грунтуючыся на назапашаных фінансавых звестках, яна навучылася даволі дакладна прадказваць, што адбудзецца ў наступны момант на рынках, і аўтаматычна аддае каманду купляць альбо прадаваць акцыі. Так працуе сучасны «хуткі трэйдынг». Прагназаванне (напрыклад, надвор'я ці сітуацыі на дарозе) — яшчэ адзін кірунак, які паспяхова рэалізуецца ўжо сёння.

Усе гэтыя задачы пад антрапаморфныя алгарытмы рашэння адносяцца да так званых некарэктных задач, калі вядомыя не ўсе даныя для іх адназначнага рашэння, а значыць, і вырашыць такую задачу можна толькі прыкладна: чым больш існуе яе параметраў (умоў), тым больш варыянтаў рашэння. Пры гэтым калі задача не можа быць вырашана ў адно дзеянне, то колькасць камбінацый, якія прыводзяць у выніку да рашэння задачы, вельмі хутка расце ў залежнасці ад колькасці крокаў. Гэта называецца «праклёнам размернасцяў».

Больш за тое, у рэальнасці на кожным кроку мы бачым фактычна бясконцую колькасць варыянтаў дапушчальных дзеянняў, а такім чынам і агульная колькасць спосабаў вырашэння праблемы бясконцая. Трымаць усе магчымыя варыянты ў галаве чалавек проста не можа, таму мозг і думае толькі мэтамі і канцэпцыямі, вырашаючы некарэктныя задачы толькі прыблізна аптымальна і перамагаючы тым самым «праклён размернасцяў».

Гэта ўменне і дазваляе нам існаваць у рэальным свеце. Чалавечы інтэлект так можа, штучны — пакуль вельмі ўмоўна і толькі для абмежаванага набору тэхнічных задач. Пры гэтым звычайна пад кожную тэхнічную некарэктную задачу будуецца свой алгарытм рашэння, што ашаламляльна адрознівае сучасны штучны інтэлект ад мозгу, здольнага вырашаць усе тыпы прапанаваных яму задач.

АДАПТЫЎНАСЦЬ

Не можа штучны інтэлект пакуль прадэманстраваць і высокую ступень адаптыўнасці. Большасці існуючых сістэм не дапаможа нават поўны аб'ём інфармацыі пра ўмовы, якія рэзка змяняюцца, каб на іх зрэагаваць. Выбіць крэсла з-пад робата прасцей простага, нават калі ён убачыць ваш рух. Выбіць крэсла з-пад чалавека, які хоць краем вока паспее заўважыць, што нешта адбываецца, значна больш складана.

Апошнім часам у гэтай вобласці з'явіліся поспехі: створаныя робаты-насільшчыкі (напрыклад Big Dog агенцтва DARPA), здольныя ўтрымліваць раўнавагу ў адказ на штуршкі і падножкі. У той жа час гэта зноў спецыфічная сістэма, распрацаваная пад канкрэтную задачу, якая не валодае ўніверсальнасцю ў адаптацыі да іншых умоў і тым больш — у вырашэнні іншых задач.

Але не толькі дзеля стварэння сістэм штучнага інтэлекту варта вывучаць мозг. Яшчэ адна важная мэта знаходзіцца ў галіне медыцыны. Прыкладна 130 мільёнаў чалавек у свеце пакутуюць ад розных хвароб мозга. Сярод іх і сусветна вядомы фізік Стывен Хокінг — у яго бакавы аміятрафічны склероз, ён прыкаваны да інваліднага крэсла. З нейкіх прычын у яго ў мозгу не працуюць маторныя нейроны, якія генерыруюць сігнал да мышцаў, але пры гэтым усе астатнія ўчасткі кары функцыянуюць выдатна. Усе прызнаюць, што Хокінг — геній. 67 мільёнаў чалавек пакутуюць ад хваробы Альцгеймера, але поўная карціна ўзнікнення гэтага захворвання невыразная. Сучасная навука ведае пра мозг так шмат — і ў той жа час так мала!

Яшчэ адзін кірунак, дзеля якога неабходна вывучаць мозг, — гэта стварэнне інтэрфейсаў «мозг-камп'ютар». Такая сістэма дазволіць кіраваць робатам або любой іншай прыладай (пратэз, сістэма «разумны дом», смартфон, праграма і г.д.) у літаральным сэнсе сілай думкі, перадаючы каманды з лобных доляў кары на камп'ютар або спецыяльны чып, які кантралюе неабходную прыладу.

Перспектыўная і такая вобласць даследаванняў, як стварэнне нейрааніматаў, гэта значыць робататэхнічных прылад, якія кіруюцца жывымі культурамі нервовых клетак у прабірцы. Сутнасць заключаецца ў тым, што на дне лабараторнага посуду, у так званай чашы Петры, размяшчаюцца электроды, на якія высаджваюцца жывыя нервовыя клеткі і дадаюцца неабходныя пажыўныя рэчывы. Неўзабаве там утвараецца і пачынае расці жывая нейронная сетка. Яе можна спрабаваць абучаць з дапамогай электродаў кіраванню неабходнай прыладай (аніматам).

Я называю гэта запасным варыянтам стварэння штучнага інтэлекту. Калі не ўдасца яго зрабіць з нежывой матэрыі, то можна паспрабаваць вырасціць кіраваныя біялагічныя сеткі. Адзначу, што ў Курчатаўскім комплексе НБІКС-тэхналогій НДЦ «Курчатаўскі інстытут» рэалізуюцца ўсе пералічаныя мною кірункі.

РАЗУМНАЯ МАШЫНА

Існуюць два базавыя падыходы да распрацоўкі штучнага інтэлекту. Першы — так званы сыходзячы, або знакавы падыход мае на ўвазе стварэнне баз ведаў, экспертных сістэм і сістэм лагічнага вываду. Мяркуецца, што сістэма зможа імітаваць мысленне, разважанне, гаворку, эмоцыі, нават творчасць. Гэта шлях найбольш прапрацаваны, але адпаведныя праграмы дагэтуль вельмі далёкія ад чалавечага мыслення.

Другі падыход — узыходзячы — прадугледжвае, што штучныя нейронныя сеткі змогуць мадэліраваць архітэктуру, уласцівасці і паводзіны свайго біялагічнага правобраза, а гэта прывядзе да стварэння інтэлектуальнага нейракамп'ютара. Калі апалагеты першага кірунку ў большасці сваёй расчараваліся ў стварэнні праграмы, якае думае, то прыхільнікі другога падыходу падзяліліся на два прыкладна роўнавялікія лагеры. Адны лічаць, што моцны штучны інтэлект магчымы, іншыя — што не.

Першыя лічаць, што штучны інтэлект зможа калі-небудзь самастойна думаць, валодаць свядомасцю і ўсведамляць сябе, другія ўпэўненыя, што не зможа. Я належу да першых, бо ніхто яшчэ не даказаў зваротнага і нават не пабудаваў дастаткова поўнай мадэлі мозгу з улікам хоць бы мінімальнага набору найбольш важных яго падсістэм. Аднак штучны інтэлект, які мысліць, калі і магчымы, то з'яўляецца вельмі далёкай перспектывай.

У Еўропе ёсць праект «Мозг чалавека». На суперкамп'ютары спрабуюць мадэляваць мозг. Стварылі дэталізаваную мадэль аднаго мільёна нервовых клетак неакортэкса. На сімуляцыю адной секунды дзейнасці гэтай сеткі суперкамп'ютар марнуе ад некалькіх гадзін да сутак, у залежнасці ад ступені дэталізацыі мадэлі.

Як вызначыць момант, калі будзе створаны паўнавартасны штучны інтэлект? Ёсць шмат варыянтаў адказу на гэтае пытанне, якія ўмоўна дзеляцца на дзве вялікія групы. Напрыклад, Алан Ц'юрынг, знакаміты брытанскі матэматык, вядомы ў тым ліку дзякуючы ўзлому кода легендарнай шыфравальнай установкі фашыстаў «Энігма», лічыў, што машына стане разумнай тады, калі зможа мець зносіны з чалавекам, а той не зразумее, што суразмоўца — не чалавек.

Іншы падыход часцей за ўсё прапагандуюць пісьменнікі-фантасты: калі машына навучыцца адчуваць і тварыць. Праўда, пакуль яшчэ не выстаўлены адназначныя крытэрыі праверкі названых дзеянняў. Хто мае рацыю — пакажа час. А пакуль патрабуюцца далейшыя захапляльныя даследаванні, якія дадуць адказы на самыя глыбокія пытанні адносна нашага з вамі самавызначэння ў гэтым свеце — таямніцы розуму.

УЛЮБЁНЫ Ў СВЯТЛО

Філуменіст з Ушачаў сабраў каля 6 тысяч этыкетак

Міхаіла БАГДАНОВІЧА можна прадставіць як кіраўніка Ушацкага дома рамёстваў. А можна — як мастака. Ён — аўтар партрэтаў Васіля Быкава, Петруся Броўкі, Рыгора Барадуліна і іншых знакамітых беларусаў, малая радзіма якіх Ушаччына. Ён быў асабіста знаёмы з Васілём Быкавым. Акрамя таго, гэты чалавек — вопытны рыбак, які не толькі ведае ўсе хітрасці лоўлі, але і сам прыдумвае снасці. Да таго ж Міхаіл Аляксандравіч — даўні падпісчык «Звязды». Але мяне ён больш за ўсё ўразіў іншай сваёй іпастассю. Міхаіл Багдановіч — калекцыянер этыкетак ад запалак. Іх у яго больш за 6 тысяч. Збірае каля 60 гадоў, пачынаючы з 1957 года.

Міхаіл Багдановіч паказвае свае акварэлі.

ЯШЧЭ Ў ШКОЛУ НЕ ХАДЗІЎ

Калекцыянераў запалкавых карабкоў і этыкетак называюць філуменістамі. У перакладзе гэта значыць тыя, хто «любіць святло». Суразмоўца захапіўся калекцыянераваннем, калі яму было каля 6 гадоў.

— Тата аднойчы вырашыў не выкідваць карабок з прыгожай этыкеткай. І мне сказаў, каб паклаў куды-небудзь. Адзін, другі, трэці... І ўзнікла такім чынам маё захапленне. Родныя, перад тым як выкінуць карабок, абавязкова паказвалі мне. Калі пападаліся аднолькавыя, пакідаў, каб абмяняцца з равеснікамі. Калі вучыцца пачаў у школе, перапісваўся з хлопчыкамі з Польшчы і Чэхіі. Іх адрасы дала мне настаўніца. Тады было модна падтрымліваць кантакты паміж вучнямі краін сацыялістычнага лагера. Педагогі ведалі пра маё хобі і дапамаглі знайсці аднадумцаў за мяжой. Адрас чэшскага калекцыянера і зараз магу агучыць. Для перапіскі выкарыстоўвалі слоўнікі, — успамінае Міхаіл Аляксандравіч.

Ён з настальгіяй расказвае пра «райскія часы», калі філуменісты маглі купіць калекцыі этыкетак нават у кіёсках «Саюздруку». І каштавалі яны нядорага. Напрыклад, 70 штук прадавалі за 70 капеек.

— Калі стаў студэнтам знакамітага мастацка-графічнага факультэта Віцебскага педінстытута, часта наведваў краму «Філатэлія» на плошчы Перамогі ў Віцебску. Мяне там добра ведалі і пакідалі навінкі, — з гонарам расказвае калекцыянер.

Калі адпраўлялі на практыку ў іншыя гарады або ў студэнцкія атрады, прыехаўшы, абавязкова заходзіў у найбліжэйшы гастраном. У чарзе адразу звярталі ўвагу на хлопца, які просіць паказаць яму запалкі. І цяпер ён падчас камандзіровак першай справай у крамы...

ГІСТОРЫЯ НА ЭТЫКЕТКАХ

У савецкія часы этыкеткі былі адлюстраваннем многіх падзей. І, як сёння модна гаварыць, трэндаў.

— Напрыклад, у канцы 1950-х гадоў каларадскі жук стаў праблемай для пасеваў. І, канешне ж, гэта не маглі не адлюстраваць на этыкетках. Рэкламавалі кукурузу. Заклікалі на цаліну, потым на БАМ. На этыкетках забаранялі заплываць за буйкі. Дарэчы, вельмі шмат карыснага было надрукавана для таго, каб людзі чамусьці вучыліся. А сёння што? Супрацьпажарная агітацыя — так, добра. Але ўпэўнены, што ёсць жа не менш актуальныя тэмы... Ды і якасць этыкетак цяпер, на жаль, не таго ўзроўню, што была калісьці, — працягвае Міхаіл Аляксандравіч.

Ён адпаведнымі прапановамі падзяліўся з прадстаўніком адной з беларускіх фабрык, дзе робяць запалкі. Выказаў гатоўнасць прапанаваць свае паслугі ў якасці мастака. Прасіў, каб прысылалі новыя этыкеткі. Але плённага супрацоўніцтва не атрымалася. Хоць мяркуе, што пасля яго званка якасць этыкетак значна палепшылася.

— А расіяне малайцы. У іх ёсць чаму павучыцца. У прыватнасці, мне вельмі падабаецца калекцыя, прысвечаная традыцыйнаму вяселлю. Чаму нашым вытворцам, напрыклад, не расказаць пра беларускія абрады, міфы, традыцыі, дасягненні? Гэта ж фарміраванне станоўчага іміджу краіны! У свеце нямала калекцыянераў... На жаль, большасць моладзі адносіцца да калекцыяніравання, як да «глупства».

Або, напрыклад, ёсць серыя з выявай гербаў беларускіх гарадоў. А ў мяне, не паверыце, няма этыкеткі, прысвечанай Ушачам. А ці ёсць такая? — задаецца пытаннем калекцыянер.

Бывае, яму прывозяць з-за мяжы карабкі. І знаёмыя ведаюць, што ён за такі падарунак будзе вельмі ўдзячны. Не абыходзіцца без казусаў. Калега пазнаёмілася з фінам і папрасіла прывесці запалкі. Той спачатку падумаў, што гэта жарт. Маўляў, грошай не хапае на запалкі. А потым шчыра смяяўся над сабой.

ЗАПАЛКІ ЯК ДОШКА АБ'ЯЎ

Калекцыянер сабраў шмат серый па розных тэмах. Ёсць прысвечаная гісторыі савецкага кіно, юбілеям Перамогі, пакарэнню космасу, народнай творчасці, навагодняму святу...

— Ды многа іх. Ёсць этыкеткі з выявай прадстаўнікоў флоры і фаўны, танцавальных ансамбляў. Існуюць і серыі, прысвечаныя зброі мінулых вякоў. На іншых — партрэты пісьменнікаў, паэтаў, нават літаратурных крытыкаў. Зацікаўленым паказваю і твары вучоных. У 1986-м надрукавалі выявы галубоў. І ўважлівы чалавек зможа навучыцца адрозніваць іх...

Як мастак і калекцыянер, Міхаіл Аляксандравіч ведае, што малюнак для этыкеткі — вышэйшы пілатаж майстэрства. Яе ствараюць з мінімумам колераў і дробных дэталяў. Гэта — калектыўная праца мастакоў і друкароў.

Этыкеткі бываюць вельмі арыгінальнымі і могуць прыносіць рэальную карысць. Напрыклад, калі ў Расіі знікненне людзей стала вялікай праблемай, пачалі друкаваць фота тых, каго шукаюць. І людзей пачалі знаходзіць.

Першая выстаўка калекцыі этыкетак Багдановіча адбылася ў 1990 годзе ва Ушачах. Потым у Наваполацку і Мінску. Некаторыя серыі былі прадстаўлены на выстаўцы «Аматарства Беларусі» — у сталіцы. Яна была прысвечаная 500-годдзю з дня нараджэння Ф. Скарыны, праводзілася пад эгідай ЮНЕСКА. Этыкеткі былі адзначаныя памятным медалём.

БЫКАЎ ЧЫТАЎ ЛЕКЦЫІ

Міхаіл Багдановіч напісаў партрэты Уладзіміра Мулявіна, Рыгора Барадуліна і Еўдакіі Лось па фота. А ў партрэце Быкава пастараўся перадаць уласнае ўражанне ад знаёмства. Пісьменнік на курсах павышэння кваліфікацыі чытаў лекцыі па літаратуры. Пашанцавала кіраўніку раённага Дома рамёстваў пачуць і Пятра Машэрава — у Доме ўрада. Ён выступаў на першым рэспубліканскім злёце студэнтаў у 1972 годзе. Тады старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Фёдар Сурганаў уручыў Міхаілу Багдановічу грамату Вярхоўнага Савета за выдатную вучобу і ўдзел у студэнцкіх будаўнічых атрадах.

Дарэчы, Дом рамёстваў ва Ушачах справіў навасэлле ў новым памяшканні два гады таму. Раней гэты будынак з гаражамі ў дварэ належаў Дэпартаменту аховы. Кіраўніцтва раёна вырашыла, што тут будзе «правіць баль» культура. Сярод канкурэнтаў былі кавярня і аўтасэрвіс. Да пераезду Дом рамёстваў нейкім цудам размяшчаўся на карыснай плошчы каля 25 «квадратаў».

Сярод экспанатаў музея народных майстроў раёна ў Доме рамёстваў — творы з дрэва Сяргея Аляксеевіча Роўбы. На жаль, майстра ўжо няма з намі. Але яго памятаюць не толькі землякі.

— Калі ён упершыню пабываў на «Славянскім базары ў Віцебску», адразу стаў «героем». Журналісты, артысты, турысты здзіўляліся яго цудоўным кіям, люлькам, бюстам. А ён і скрыпкі рабіў! Пры гэтым не меў прафесійнай адукацыі. Быў вельмі незвычайным. Уявіце сабе: браў інструменты і фарбы і ў лесе рабіў нешта, а потым пакідаў... Каб мінакі ўбачылі і здзівіліся. Сястра ўмельца перадала нам у дар нямала экспанатаў. Магла б і больш, але злодзеі ўкралі з дома шмат чаго, — расказаў Міхаіл Багдановіч.

Дырэктар Ушацкага дома рамёстваў — аўтар брэнда раёна «З крыніц спрадвечных», які стаў пераможцам абласнога конкурсу на «Славянскім базары — 2015». Міхаіл Аляксандравіч намаляваў эскізы для партызанскіх зямлянак на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу «Прарыў». Некаторыя канструкцыі ўжо можна ўбачыць.

У планах Багдановіча і яго калег стварэнне казачнага дворыка каля Дома рамёстваў. Пастараюцца, каб напярэдадні навагодніх свят дзятва ўбачыла розныя «дзівы». Так што завітаеце ва Ушачы, абавязкова зірніце, што ў Багдановіча і яго каманды атрымалася. Ну і запалкі можаце прывезці, філуменіст будзе ўдзячны.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by
Ушачы — Віцебск.

У калекцыі Міхаіла Багдановіча ёсць і блізкія для кожнага супрацоўніка і чытача «Звязды» этыкеткі за 1961 год.

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ АУКЦИОНЕ 15 ноября 2016 г. ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ в г. Пинске

Наименование объекта	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-50656 «Административное помещение с коммуникациями»	Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-54079 «Деревообрабатывающий цех»
Номер лота	1	2
Местонахождение объекта	г. Пинск, ул. Калиновского, 11-1	г. Пинск, ул. Калиновского, 11Г-1
Тип помещения	Совмещенное с другим изолированным помещением	Совмещенное с другим изолированным помещением
Общая площадь (кв.м)	3482,1	12954,0
Площадь земельного участка для обслуживания строения (га)		
Начальная цена (рублей)	266 185,82	1 459 960,87
Сумма задатка (рублей)	26 618,6	145 996,1
Условия продажи	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством	Возможна рассрочка в соответствии с действующим законодательством
Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв.м), решение об отводе земельного участка	Здание трехэтажное с внутренними собственными коммуникациями (водопроводная, канализационная сеть, линия электропередач). Имеется отопление (собственная котельная). Ввод в эксплуатацию – 1971 г.	Одно и двухэтажное, в состав входит: склад пиломатериалов с бетонным покрытием 3051,3 м², сушильные камеры 6 шт., навес 72 м², циклоны 3 шт., помещение для газовой сварки со складом, санитарно-бытовые и административные помещения, асфальтобетонное и бетонное покрытие 4979 м², электрический кабель 96,7 м, ливневая и фекальная канализация 203,8 м. Ввод в эксплуатацию – 1972 г.
Продавец объекта	Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут»	
Организатор аукциона	Ликвидационная комиссия ОАО «Пинский КСИ», ТУП «ПриБут»	

Аукцион состоится 15 ноября 2016 года в 11.00 по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского, 11 в актовом зале.

Перечень необходимых документов:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение с ликвидационной комиссией ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии», ТУП «ПриБут».

2. Заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка: на расчетный счет ОАО «Пинский комбинат строительной индустрии» р/счет 3012470120029 в РКЦ №37 в г. Пинске филиала ОАО «Белагропромбанк» – Брестское областное управление, код 401, УНП 200305504, срок внесения суммы задатка – **по 14 ноября 2016 г. включительно.**

3. Индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором торгов.

4. Юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, и их подлинники, для заверения их копий организатором торгов.

5. Представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор торгов имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; в течение 3-х рабочих дней со дня проведения аукциона возместить затраты на оценку, организацию и проведение аукциона; подписать договор купли-продажи недвижимого имущества в течение 10-ти рабочих дней со дня проведения аукциона

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Пинск, ул. Калиновского 11, каб. 2 с 9.00 до 15.00 по рабочим дням **по 14 ноября 2016 года включительно**, тел. 80165-37-16-07, тел./факс (80165) 37-16-66.

Контактный телефон 375-29-640-80-37.

Департамент по ценным бумагам
Министерства финансов Республики Беларусь
ЗАРЕГИСТРИРОВАНО
11 октября 2016
Сушко С.А.

УТВЕРЖДЕНО
Протокол внеочередного
Общего собрания участников
СООО «ВильнюсСтрой»
от 22 сентября 2016 года

ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОСПЕКТ ЭМИССИИ ЖИЛИЩНЫХ ОБЛИГАЦИЙ третьего выпуска

Совместное общество с ограниченной ответственностью «ВильнюсСтрой» г. Минск

Внести в Проспект эмиссии жилищных облигаций третьего выпуска следующие изменения:

1. в пункте 2.2:

1.1. в подпункте 2.2.1 слова «16 165 000 000 (Шестнадцать миллиардов сто шестьдесят пять миллионов) белорусских рублей» заменить словами «1 616 500 (один миллион шестьсот шестнадцать тысяч пятьсот) белорусских рублей»;

1.2. в части первой подпункта 2.2.2 слова «6 100 000 (Шесть миллионов сто тысяч) белорусских рублей» заменить словами «610 (шестьсот десять) белорусских рублей»;

2. по тексту подпункта 2.4.1 пункта 2.4 слова «5 490 000 000 (пять миллиардов четыреста девяносто миллионов) белорусских рублей», «10 675 000 000 (десять миллиардов шестьсот семьдесят пять миллионов) белорусских рублей» заменить соответственно словами «549 000 (пятьсот сорок девять тысяч) белорусских рублей», «1 067 500 (один миллион шестьдесят семь тысяч пятьсот) белорусских рублей».

ОТ ЭМИТЕНТА:
Директор СООО «ВильнюсСтрой» Н.М.Яколцевич
Главный бухгалтер СООО «ВильнюсСтрой» Т.С.Журавская
ОТ ЛИЦ, ПРЕДОСТАВИВШИХ ОБЕСПЕЧЕНИЕ:
Подтверждаю достоверность информации об обеспечении:
Директор ЗАО «МОРТЕКС БЦЗ» С.В.Сильченко
